Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 789.

Матэр'ял прымаецца з 9-й да 3½ гадз. Нявыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 2.. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. 3 — 2 р. 70 к. 6 — 4 р. — к. 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародняя — 20 к., мясцовым — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок нанпарэлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок нанпарэлі насярод тэксту 1 р. — к. За радок нанпарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьпешныя на 50 проц. даражэй. Звыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумэнт 35 кап. За кожны дадатковы 15. Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумэнт 15. За кожны дадатковы 5. Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 34 (2222) Чацьвер, 9-га лютага 1928 г.

МЯСЦОВЫЯ БЮДЖЭТЫ БССР НА 1927-28 ГОД.

СНК выслухаў даклад аб мясцовых бюджэтах БССР на 1927-28 г. Агульны свод мясцовых бюджэтаў БССР на 1927-28 г. прыняты СНК у суме 43612,2 тыс. руб. Гэта ў параўнаньні з фактычна выкананымі выдаткамі па мясцовых бюджэтах 1926-27 г. дае павялічэньне на 13,6 проц., а ў адносінах да бюджэтных прызначэньняў на 1926-27 г. прырост складае 9,2 проценту (калі адкінуць мэтавы кватэрны падатак, прырост бюджэту ў параўнаньні з фактычным выкананьнем 1926-27 г. складзе 12,7 проценту).

Невялікі, у параўнаньні з папярэднімі гадамі, тэмп росту мясцовых бюджэтаў на 1927-28 г. тлумачыцца стабільнасьцю даходаў у параўнаньні з 1926-27 г. (з прычыны сканчэньня адбудоўчага працэсу ў народнай гаспадарцы), але ўсё-ж такі, калі параўнаць гэты рост з ростам валавай прадукцыі народнай гаспадаркі БССР, то гэты рост зьявіцца зусім нармальным.

Адносна даходнай часткі СНК адзначыў, што больш інтэнсыўны рост падатковых даходаў у параўнаньні з непадатковымі, які наглядаўся ў 1926-27 г., працягваецца і ў мясцовых бюджэтах на 1927-28 г. Напрыклад, удзельная вага падатковых даходаў павялічваецца з 54 проц. у 1926-27 г. да 56,4 проц. усіх тэрытарыяльных даходаў у 1927-28 г.

У мясцовых бюджэтах на 1927-28 г. чакаецца большы рост мясцовых даходаў на 11,9 проц., як у дзяржаўных (на 5,1 проц.).

Калі ў мясцовых бюджэтах на 1926-27 г. сярод усіх тэрытарыяльных даходаў мясцовыя даходы складалі 46,2 проценту, то ў бюджэце на 1927-28 г. яны ўжо складаюць 47,7 проц.

Такім чынам павялічваецца ўдзельная вага ўласных даходаў мясцовага бюджэту і адпаведна зьніжаецца ўдзельная вага адлічэньняў і дапамог ад дзяржаўнага бюджэту БССР. Гэта сьведчыць аб умацненьні асноўнай базы мясцовых бюджэтаў.

Што датычыцца выдатковай часткі мясцовых бюджэтаў, то на 1927-28 г. у іх працягваецца тэндэнцыя да праданьня мясцоваму бюджэту вытворчага і культурна-асьветнага характару.

Ня гледзячы на рост бюджэту, адміністрацыйна-кіраўнічыя выдаткі зьніжаюцца на 18,5 проц. у параўнаньні з папярэднім годам, а іх удзельная вага сярод усіх выдаткаў па мясцовых бюджэтах зьніжаецца з 17,2 проц. да 13,6 проц.

Выдаткі на сацыяльна-культурныя патрэбы ў параўнаньні з 1926-27 г. павялічваюцца на 21,2 проц., а іх удзельная вага сярод усіх выдаткаў мясцовых бюджэтаў павялічваецца з 51,5 проц. у 1926-27 г. да 53,8 пр.

У прыватнасьці, выдаткі на народную асьвету вызначаны ў 16.102,8 тыс. руб.—на 21,8 проц. больш, як у папярэднім годзе. Сярод гэтых выдаткаў можна адзначыць, як новае мерапрыемства, асыгнаваньне 30 тыс. руб. на арганізацыю кароткатэрміновых сельска-гаспадарчых курсаў. На ахову здароўя вызначаецца 5.357,2 тыс. руб.—на 9,6 пр. больш, як у папярэднім годзе, з іх 100 тыс. руб. мяркуецца выдаткаваць на будаўніцтва Барысаўскай больніцы.

Але найбольшы рост даюць выдаткі на народную гаспадарку, якія ў параўнаньні з фактычным выкананьнем у 1927-27 г. павялічваюцца на 26,1 пр.

Як відаць, дасягненьне ў сэнсе пераходу ў бок гаспадарча-вытворчых выдаткаў, якое вызначылася ў мясцовых бюджэтах БССР у 1926-27 г., замацоўваецца і на 1927-28 г.

Капітальныя ўкладаньні ў мясцовую гаспадарку па мясцовых бюджэтах на 1927-28 г. СНК прыняты ў суме (з уключэньнем жыллёвага будаўніцтва па доўгатэрміноваму камунальнаму крэдыту) 12.257,5 т. р., што ў параўнаньні з фактычнымі выдаткамі 1926-27 г. дае рост на 22,8 пр.

У паасобку капітальныя ўкладаньні ў мясцовую прамысловасьць і камунальныя прадпрыемствы па бюджэту СНК прыняты ў суме 2.790 т. р. (без Асінаўскага будаўніцтва). Асыгнаваньні з агульна-бюджэтных рэсурсаў на мясцовую прамысловасьць і камунальныя прадпрыемствы павялічваюцца ў параўнаньні з мінулым годам і складаюць 1.600 тыс. руб. Так, у 1926-27 г. капітальныя ўкладаньні ў прамысловасьць з агульна-бюджэтных сродкаў складалі 5 пр. усяе сумы бюджэту, а ў бягучым годзе, разам з выдаткамі на фінансаваньне Асінбуду па мясцоваму бюджэту гэтыя выдаткі складаюць ужо 7,7 пр. усяе сумы бюджэту. Такім чынам індустрыялізацыя краіны знаходзіць свой адбітак у мясцовым бюджэце на 1927-28 г.

Значна павялічылася ўдзельная вага ў бюджэце камунальнага крэдыту на патрэбы жыллёвага будаўніцтва. Гэта дае магчымасьць мясцовым саветам павялічыць агульныя асыгнаваньні на жыллёвы фонд. Так, у 1926-27 г. выдаткі на новае будаўніцтва і капітальны рамонт па жыллёваму фонду вызначаўся ў суме 1.810 тыс. руб., а ў 1927-28 г. мяркуецца ўжо ў суме 2.400 тыс. руб., што дае рост на 32,5 проц.

Наогул, у мясцовых бюджэтах на 1927-28 г. прадугледжана фінансаваньне шмат капітальных пабудоў.

Так, СНК прызнаў неабходным пачаць пабудову трамваю ў г. Менску ў бягучым-жа годзе, на што прадугледжаны водпуск па мясцоваму бюджэту 250 тыс. руб. і даручыў Дзяржпляну разглядзець плян пабудовы трамваю, а таксама вызначыць крыніцы фінансаваньня работ і тэрміны будаўніцтва і падаць гэта на канчатковае зацьверджаньне ў СНК.

Далей, Віцебскаму АВК дазваляецца прадугледзець выдаткі на пракладку ў Віцебску новай трамвайнай лініі да рабочага пасёлку Маркаўшчына.

Бюджэтам таксама прадугледжана асыгнаваньне 150 тыс. руб. на капітальны рамонт Гомельскай электрычнай станцыі. У выніку гэтага рамонту Гомельская электрастанцыя зможа значна пашырыць абслугоўваньне мясцовай прамысловасьці і насяленьня. З іншых асыгнаваньняў на камунальнае будаўніцтва па мясцоваму бюджэту прадугледжана асыгнаваньне сродкаў на пабудову вадаправоду ў Полацку.

І нарэшце сярод іншых работ можна адзначыць асыгнаваньне 100 тыс. руб. на сканчэньне будаўніцтва халадзільніка ў Менску і вялікага масту праз раку Сож (200 тыс. руб).

Выдаткі на сельскую гаспадарку (без асобных выдаткаў) СНК прыняты ў суме 2.044,9 тыс. руб., на 21,3 проц. больш, як у 1926-27 г. З выдаткаў на сельскую гаспадарку можна адзначыць 120 т. р. на пабудову і пераабсталяваньне агранамічных пунктаў.

У галіне заработнай платы мясцовымі бюджэтамі на 1927-28 г. прадугледжваецца далейшае дзяржаўнае нармаваньне заработнай платы, а таксама павялічэньне ставак для мясцовых насад, як школьных, мэдыцынскіх і аграномічных працаўнікоў, таксама і міліцыянэраў і ніжэйшых тэхнічных служачых. Гэта памяншае разрыў у адносінах заработнай платы паміж дзяржаўным і мясцовымі бюджэтамі.

Рост фонду заработнай платы СНК вызначаны ў суме каля 2.600 т. р. або на 15 проц. адносна да фактычнага выкананьня за 1926-27 г.

1927-28 г. павінен зьявіцца годам далейшага набліжэньня мясцовага бюджэту да нізавых тэрытарыяльных адзінак. Ня гледзячы на скарачэньне ліку гэтых адзінак, лік нізавых бюджэтаў павялічыўся—лік сельскіх бюджэтаў павялічыўся з 13 да 63, а мястэчковых—з 12 да 19.

СНК прызнаў патрэбным памяншэньне дэфіцытнасьці раённага бюджэту шляхам перадачы яму ўсіх магчымых мясцовых крыніц даходаў і адлічэньняў ад дзяржаўных падаткаў і збораў.

У зьвязку з разгортваючымся капітальным будаўніцтвам на мясцовай гаспадарцы, каб палепшыць выкананьне капітальных работ і ўпарадкаваць фінансаваньне іх, СНК запрапанаваў акруговым выканаўчым камітэтам скласьці сьпіс мерапрыемстваў у галіне капітальнага будаўніцтва на бліжэйшыя 5 год з эканамічным і фінансавым абгрунтаваньнем гэтых мерапрыемстваў. Сьпісы гэтыя не пазьней 1-га красавіка 1928 г. павінны быць пададзены ў Дзяржаўную Плянавую Камісію для ўзгадненьня ў рэспубліканскім маштабе. Разам з гэтым акруговым выканаўчым камітэтам забараняецца ўтвараць новае капітальнае будаўніцтва па бюджэту 1927-28 г. без папярэдняга праходжаньня адпаведных плянаў праз Дзяржплян.

Разам з гэтым акруговым выканаўчым камітэтам запрапанавана і ў далейшым ісьці па шляху спрошчаньня і патаненьня кіруючага апарату.

Каб унесьці больш дакладнасьці ў складаньне мясцовых бюджэтаў СНК прызнаў патрэбным, каб да пачатку бюджэтнай кампаніі 1928-29 г. былі распрацаваны нормы абслугоўваньня ўстаноў народнай асьветы і аховы здароўя.

І нарэшце СНК даручыў Народнаму Камісарыяту Фінансаў падаць у СНК да 1 мая праэкт дырэктыў па складаньні мясцовых бюджэтаў на 1928-29 г. і аб парадку іх праходжаньня, а Народнаму Камісарыяту Працы свае прапановы па пытаньні заработнай платы.

Адзначыўшы, што даходная частка мясцовых бюджэтаў вылічана з вялікай напружанасьцю, СНК запрапанаваў усім выканкомам мець самы строгі нагляд за выкананьнем на ўсе 100 проц. усіх вылічаных па мясцовым бюджэце прыбыткаў.

Правакацыйныя чуткі з ангельскіх крыніц.

МАСКВА, 7-II. Апошнімі днямі некаторыя органы чужаземнага друку распаўсюджвалі хлусьлівыя паведамленьні, што нібы марскі раён, сумежны з Фэадасійскім портам, загароджаны мінамі і зачынены для плаваньня гандлёвых суднаў.

Як выявілася з паведамленьня з Турцыі, першаю крыніцаю гэтых зацятых фальшывых вестак, распаўсюджаных у чужаземным друку, было ангельскае генэральнае консульства ў Канстантынопалі. Афіцыёзная турэцкая газэта „Міліет" паведамляе ў нумары ад 31-га студзеня, што брытанскі камэрцыйны аташэ ў Канстантынопалі паведаміў канстантынопальскай управе гандлёвага флёту аб зачыненьні савецкім урадам уваходу ў Фэадасійскі порт для ўсіх суднаў. Анаталійскае тэлеграфнае агенцтва пацьвярджае, што гэтыя чуткі ідуць ад ангельскіх прадстаўнікоў у Канстантынопалі і зазначае, што яны нічым не пацьвярджаюцца. Не зважаючы на адхіленьні, зробленыя з памянёнае крыніцы, выдумка ня спыняе цыркуляваць заграніцаю.

ТАСС упаўнаважан катэгарычна заявіць, што гэтыя чуткі зьяўляюцца ад пачатку да канца ні на чым неабгрунтаванаю злоснаю выдумкаю.

Спробы Саймона „прыцягнуць сымпатыі" Індыі.

ЛЁНДАН, 7-II. Водлуг паведамленьняў з Нью-Дэлі (Індыя) Саймон (старшыня прыбыўшае ў Індыю ангельскае камісіі па перагляду канстытуцыйных рэформаў у Індыі) паслаў віцэ-каралю Індыі ліст, у якім прапануе наладзіць супольную нараду камісіі з 7-ю ўдзельнікамі агульна-індыйскага заканадаўчага збору. Як камісія, так і прадстаўнікі заканадаўчага збору пададуць потым асобна свае даклады ангельскаму парляманту. Копія ліста Саймона была перададзена ўсім членам агульна-індыйскага нацыянальнага збору.

НІЧОГА СУПОЛЬНАГА З КАМІСІЯЙ САЙМОНА.

ЛЁНДАН. 7-2. Агенцтва Рэйтэра паведамляе з Нью-Дэлі (Індыя): „Лідэры індыйскіх партый агаласілі заяву, у якой гаворыцца, што яны ўважліва разгледзелі плян дзейнасьці, зазначаны ў заяве Саймона. Лідэры партый зазначаюць, што іх супярэчаньні працы камісіі, як такое, і пляну не працы абасноўваны на прынцыпах, якіх плян Саймона не закранае. З гэтае прычыны партыі павінны застацца пры сваёй пастанове, згодна якое яны не могуць мець нічога супольнага, у якой там ні было-б форме, з камісіяй Саймона».

ЭКСПАНСІЯ АНГЕЛЬСКАГА КАПІТАЛУ Ў АЗІЮ.

ЛЁНДАН. З Палястыны паведамляецца, што ў Тэл-Авіву прыехаў старшыня буйнейшага ангельскага хімічнага канцэрну Монд, вядомы, як ініцыятар перамоў з генэральнаю радаю кангрэсу трэд'юніёнаў аб устанаўленьні «міру ў прамысловасьці». З Тэл-Авіву Монд накіроўваецца ў Хойфу і Багдад. Перадаюць, што падарожжа Монда ў Палястыну зьвязана з шырокімі прамысловымі плянамі канцэрну Монда на Блізкім Усходзе. Хайфа мае быць канечным пунктам намечанага да пабудовы нафтаправоду, які злучыць ангельскія нафтавыя промыслы ў Масуле з Міжземнаморскім узьбярэжжам.

Афіцыйнаю мэта падарожжа Монда ў Палястыну—дапамагчы жыхарству Палястыны з сродкаў і па даручэньні дабрачыннае сіяніцкае арганізацыі, на чале якое Монд стаіць.

ВАКОЛ ПАДЗЕЙ У КІТАІ.

УВАХОД РЭВАЛЮЦЫЙНАГА ВОЙСКА У ГУАНДУНЬ.

ШАНХАЙ, 7.2. Водлуг паведамленьняў «Рэспубліке Дэйлі Ньюс» з Ганконгу, атрад камуністаў з правінцыі Хунань перайшоў граніцу Гуандуні і заняў 3-га лютага прыгранічны горад Піншы.

ВЫСАДКА ЯПОНСКАГА ДЭСАНТУ.

ШАНХАЙ, 7-2. «Чайна Таймс» паведамляе, што японскія маракі, якія высадзіліся з падводнае лодкі на тэрыторыі жалезных капальняў у Дае, штодзень праводзяць манэўры. Японскае марское камандаваньне папярэдзіла, што ў выпадку захопу капальняў нацыяналістамі на бераг будзе высаджана яшчэ 600 японскіх маракоў.

АБМЕЖАВАНЬНЕ ПРАВОЎ ФАБЗАВКОМАЎ У НЯМЕЧЧЫНЕ.

БЭРЛІН, 3-II. Камісія рэйхстагу па сацыяльна-палітычных пытаньнях абмяркоўвала ўрадавы праэкт зьмены закону аб фабрычна-заводзкіх камітэтах. Камуністычны дэпутат Рэдэль выступіў з вострай крытыкаю ўрадавых партый, якія падтрымліваюць імкненьне прадпрымцаў зьнішчыць фабрычна-заводзкія камітэты.

Прапанова ўрадавых партый складаецца з наступнага: у тым выпадку, калі выбарчы камітэт па арганізацыі выбараў новага фабзавкому не назначан старым фабзавкомам, ці ўласьнікам прадпрыемства, дык прапанова аб назначэньні яго можа быць пададзена толькі старшынёю суда па працоўных справах.

Сацыял-дэмакраты ўхіліліся ад крытыкі прапановы ўрадавых партый і толькі падалі папраўку, водлуг якое прафсаюзы таксама павінны мець права падаваць прапанову аб назначэньні выбарчага камітэту. Не зважаючы на тое, што праэкт урадавых партый быў ухвалены з папраўкаю сацыял-дэмакратаў, ён усё-ж такі ў корні падрывае існуючы ў Нямеччыне закон аб фабрычна-заводзкіх камітэтах.

Проці праэкту ўрадавых партый галасавалі толькі адны камуністы.

НЕПАРАЗУМЕНЬНЕ ЗЬНІШЧАНА.

БЭРЛІН, 2-II. Чуткі, распаўсюджаныя нямецкім друкам са слоў ранейшага нямецкага ваеннапалоннага Штапэля аб тым, што нібы ў СССР знаходзіцца зараз яшчэ каля 150 нямецкіх ваеннапалонных, пазбаўленых магчымасьці вярнуцца ў Нямеччыну, адхілены цяпер самім Штапэлем у дакладзе, з якім ён выступіў у Потсдаме. Апавядаючы аб сваім жыцьці ў СССР, Штапэль падкрэсьліў, што ён ня ведае ніводнага выпадку прымусовага затрыманьня нямецкіх ваеннапалонных у СССР. Штапэль зазначыў, што калі хто-небудзь у сучасны момант з ранейшых ваеннапалонных пражывае ў СССР, дык толькі ў якасьці поўнапраўнага вольнага грамадзяніна.

Сваім дакладам Штапэль канчаткова паклаў канец чуткам аб тым, нібы яго прымушалі набыць савецкае грамадзянства.

БАРАЦЬБА ВАКОЛ САВЕЦКАЕ НАФТЫ.

СПРОБА АСОБНЫХ НАФТАВІКОЎ ПРЫМІРЫЦЬ ДЭТЭРДЫНГА З РАКФЭЛЬЛЕРАМ.

НЬЮ-ЁРК, 7-II. «Нью-Ёрк-Таймс» паведамляе, што між некаторымі амэрыканскімі і ангельскімі нафтапрамыслоўцамі адбываюцца сакрэтныя нарады, якія ставяць мэтаю пагадзіць канфлікт між англа-галяндзкім трэстам «Ройяль Дэйтч Шэл», на чале з Дэтэрдынгам і амэрыканскім трэстам «Стандарт Ойль». Водлуг слоў газэты, нафтапрамыслоўцы, якія не бяруць непасрэднага ўдзелу ў барацьбе між гэтымі трэстамі, імкнуцца якім-небудзь чынам папярэдзіць цяжкія вынікі стратнага зьніжэньня цэн на нафту, якое зьяўляецца адным з сродкаў у гэтай барацьбе. Адначасна газэта паведамляе, што «Англа-Амэрыкен Ойль Кампані» (англа-амэрыканская нафтавая кампанія), якая займаецца збытам нафтавае прадукцыі «Стандарт Ойль Кампані Нью-Джэрсі", заявіла аб сваёй гатоўнасьці ўзяць удзел у барацьбе проці Дэтэрдынга. Газэта адзначае, што «Стандарт Ойль Кампані Нью-Джэрсі» ў пачатку падтрымлівала выступленьне Дэтэрдынга проці здзелак з савецкаю нафтаю, але ў сучасны момант не выказваецца ні за, ні проці такіх здзелак; што-ж датычыць «Стандарт Ойль Кампані Нью-Ёрк», дык яна ня спыняе закупак савецкае нафты.

ВІКОНТ ГОТО АБ СССР.

ТОКІЁ, 7-2. Гото і яго падарожнікі вярнуліся сёньня ў Токіё з падарожжа па СССР.

У гутарцы з прадстаўнікамі друку Гото заявіў, што перакананы ў магчымасьці эканамічнага і культурнага збліжэньня між Японіяй і СССР, не зважаючы на неаднолькавыя структуры абедзьвюх дзяржаў. Гото зазначыў таксама, што ён паглядаў шпаркае аднаўленьне прамысловасьці ў СССР у выніку новае эканамічнае палітыкі.

Тэрор проці калёрадзкіх стачачнікаў.

НЬЮ-ЁРК. Паліцыя і войска ня спыняе ўціскаць „бастуючых гарнякоў у Калёрада. У часе нападу паліцыі на памяшканьне кіруючае забастоўкаю арганізацыі „індустрыяльных рабочых сьвету" ў Уолсэнбурзе двое рабочых былі забіты. Не зважаючы на прызнаньне суда, што забойства нічым не было выклікана, і паліцыя выявіла поўную недбайнасьць у адносінах да чалавечага жыцьця», проці паліцыі ня было ўжыта ніякіх мер. Прыняты за бастуючага рабочага мурын быў таксама забіты паліцыяй.

Ёсьць весткі, што мэксіканскія рабочыя, якія прымалі ўдзел у забастоўцы ў Калёрада, былі арыштаваны і тайна высланы ў самыя пустэчныя месцы Мэксікі.

РЭПРЭСІІ ПРОЦІ КАМУНІСТЫЧНАЕ „ДЭЙЛІ УОРКЕР".

НЬЮ-ЁРК, 7-2. Сёньня арыштаваны рэдактар «Дэйлі Уоркер» (орган Уоркерс Парты) Дэнн, ранейшы рэдактар тае-ж газэты Баттэльман і ранейшы адміністратар газэты Мільлер. Проці іх высунута абвінавачаньне ў парушэньні закону аб прыстойнасьцях у зьвязку з паэмаю, якая ў сакавіку леташняга году зьявілася на старонках газэты, дзе Амэрыка раўнялася з прастытуткаю.

Арышт Дэнна і іншых сьведчыць аб новай спробе знайсьці прычэпку, каб зачыніць «Дэйлі Уоркер». Дэнн ужо адседзеў у астрозе месяц да таго, як справа разглядалася першы раз, а Мільлер—тыдзень. Рэдакцыя «Дэйлі Уоркер» была ўжо аштрафавана па гэтай справе на 500 даляраў. У выпадку, калі суд прызнае вінаватасьць абвінавачваемых, дык ім пагражае зьняволеньне ў астрозе да 5 гадоў.

Адначасова выдан загад аб арышце члена ЦК «Уоркерс Парты» Энг Далла.

Да ўсіх сяброў МОПР'у, да ўсіх працоўных БССР.

7 ЛЮТАГА 1928 Г. У ГОР. БЕЛАСТОКУ ФАШЫСЦКІ УРАД ПІЛСУДЗКАГА АРГАНІЗОЎВАЕ РАСПРАВУ НАД 133 РАБОЧЫМІ І РАБОТНІЦАМІ, СЯЛЯНАМІ І СЯЛЯНКАМІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ.

Польская буржуазія ня раз карысталася падлогамі і правакатарамі для крывавага прыдушэньня рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі. Растрэлы сялян у Косаве, разгром Беларускай Грамады і збойства яе дэпутатаў, арышты і збойствы сялян і рабочых у дэфэнзыве зьяўляюцца яскравымі выяўленьнямі крывавага фашысцкага тэрору ў Польшчы.

Аднак, гэты тэрор ня мог зьнішчыць імкненьняў рабочых і сялян Заходняй Беларусі да свайго сацыяльнага і нацыянальнага вызваленьня.

Фашысцкі ўрад Пілсудзкага, які падтрымліваецца польскімі меншавікамі-пэпээсаўцамі, у зьвярынай злосьці і ненавісьці да нацыянальна-рэвалюцыйнага руху і Савецкага Саюзу спрабуе дабрацца да асновы руху—разграміць камуністычную партыю.

Польскі фашызм фізічным зьнішчэньнем барацьбітоў і ссылкаю прадстаўнікоў працоўных Заходняй Беларусі спадзяецца справіцца з вялікім вызваленчым рухам працоўных мас і развязаць сабе рукі для будучай вайны.

Польскі фашызм і яго гаспадары—ангельскія імпэрыялісты, чуючы гістарычную неўхільнасьць сваёй пагібелі, рыхтуюць новую вайну, у патоку крыві якой хочуць пахаваць вялікую мэту працоўных мас—пабудову новай сацыялістычнай грамады.

Ідэя ўтварэньня адзінай вольнай Савецкай Беларусі, шчыльна зьвязанай адзіным саюзам працоўных усіх нацый і народаў, глыбока жыве ў сэрцы кожнага працоўнага Заходняй Беларусі і Польшчы.

Ні тэрор, ні рэпрэсіі ня спыняць вялікага руху працоўных мас да сацыялізму.

Працоўныя вольнай Савецкай Беларусі, Вы намала пралілі крыві ў барацьбе з польскай буржуазіяй і абшарнікамі. Кроў вашых братоў у Заходняй Беларусі цячэ і зараз. З іх шэрагаў польскі фашызм вырывае лепшых сыноў.

Працэс „133" ёсьць пачатак абдуманага пляну польскага фашызму, дзікай расправы з беларускім народам і яго вызваленчымі імкненьнямі. За ім пойдзе шэраг працэсаў над Работніцка-Сялянскай Грамадой і яе дэпутатамі. На працэсе Беларускай Грамады прыцягваецца 490 абвінавачаных і блізка тысячы сьведак. Гэтыя масавыя працэсы сьведчаць, што ў Польшчы падрыхтоўваецца суд-расправа над цэлым народам.

Рабочыя, сяляне і ўсе працоўныя вольнай Савецкай Беларусі! Ахвяры з кожным днём павялічваюцца. Наша маральная і матэр'яльная дапамога павінна ўзмацніцца.

Пратэстуйце проці разгрому рэвалюцыйнага руху Заходняй Беларусі. Склікайце мітынгі пратэсту. Выказвайце ганьбу польскім катам. Не давайце ўчыніць фашысцкім катам чарговага злачынства над працоўнымі масамі Заходняй Беларусі.

Патрабуйце вызваленьня прыцягнутых да справы „133". Дамагайцеся вызваленьня беларускіх дэпутатаў і 6000 палітычных вязьняў у Польшчы. Узмацняйце міжнародную пралетарскую салідарнасьць.

Запісвайцеся ў шэрагі МОПР'у!

Дапамагайце вязьням капіталу!

Няхай жыве МОПР! Няхай жыве камуністычная партыя Польшчы і Заходняй Беларусі!

Няхай жывуць працоўныя Заходняй Беларусі і Польшчы, якія змагаюцца за сваё вызваленьне!

ЦК МОПР'у БССР.

Менск, 6 лютага 1928 г.

Перадвыбарчыя рэпрэсіі пілсудчыны.

Пілсудчыкі зрываюць выбарчую кампанію.

ВАРШАВА, 7-2. Правы друк абвінавачвае пілсудчыкаў у заснаваньні спэцыяльнае баявое дружыны для зрыву мітынгаў варожых пілсудчыкам партый. Газэты падаюць даныя аб дапамозе паліцыі дружыньнікам-пілсудчыкам.

Разгон мітынгу блёку нацменшасьцяў.

Гэтымі днямі блёк нацменшасьцяў у Варшаве склікаў мітынг. Аграмадны натоўп ня мог умясьціцца ў будынку і нават на панадворку, так што нават рух трамваяў быў спынен. У хуткім часе зьявілася паліцыя. Пасьля некалькіх прамоў мітынг па загаду паліцыі быў распушчан.

Разгон мітынгу ППС-лявіцы.

Гэтымі днямі ППС-лявіца склікала ў Львове мітынг. Як толькі пачаў прамову нейкі Ружыцкі, паліцыянт зачыніў сход, прычапіўшыся да аднаго выразу, быццам абразіўшага ўрад. У залі падняўся гвалт. Тады паліцыя сілаю выдаліла прысутных з залі. Некалькі асоб арыштавана.

Санацыйныя недарэчнасьці.

Як мы ўжо паведамлялі, «Беспартыйны блёк супрацоўніцтва з урадам» выставіў па Віленскай акрузе кандыдатуры маёра М. Касьцялкоўскага і „кансэрватара" С. Мацкевіча. Санацыйны „Кур'ер Ві.", абгаварваючы гэты факт, піша: „Так ужо нешчасьліва вышла, што іменна віленская дэмакратыя стала афярай, бяручы на свае плечы п. С. Мацкевіча. Можам на гэта пажаліцца, але павінны з гэтым, як з неабходным злом, згадзіцца".

Выходзіць так, што санацыйны блёк у імя супрацоўніцтва з урадам Пілсудзкага прымусіў віленскую дэмакратыю выбіраць у сойм вядомага ворага гэтай дэмакратыі.

Разгон бундаўскага мітынгу.

4 лютага г. г. у Варшаўскім тэатры „Скаля" адбываўся бундаўскі мітынг. У часе прамовы раднага Навагрудзкага няўкрытыя авантурнікі пачалі дэбош і скандал, пасьля чаго паліцыя зачыніла мітынг.

Такія спосабы разгону мітынгаў, непажаданых адміністрацыі, здараюцца цяпер у Польшчы досыць часта.

Кандыдатура Ф. Умястоўскага.

Супрацоўнік правакатара Гурына-Маразоўскага і сам дэфэнзыўны дзеяч і рэдактар „Беларускага Дню" п. Ф. Умястоўскі выстаўлен «Беспартыйным блёкам супрацоўніцтва з урадам» кандыдатам у сойм па Сьвянцянскай акрузе—але аж на 4-м месцы.

Наўрад ці пры такіх умовах ён можа папасьці ў сойм.

ППС і Рагуля.

„Роботнік" паведамляе, што ў Навагрудку адбыўся 30 студзеня г. г. мітынг, на якім пэпээсы мелі быццам вялікі посьпех, а Рагуля, які выступаў ад імя «Белсельсаюзу», быў спатканы агульным пратэстам і крыкамі: «Прэч з здраднікам працоўнага народу».

Лік выбіральнікаў у Польшчы.

Паводле правізарычных падлічэньняў 64 акруговых камісій лік выбіральнікаў на выбарах у польскі сойм раўняецца 13.760.000.

„Таймс" аб выбарах у Польшчы.

Варшаўскі карэспандэнт «Таймсу» надрукаваў у памянёнай газэце артыкул аб выбарах у Польшчы, у якім між іншым піша: „Урадавыя сьпіскі з прычыны іх нешанага характару ня ўзбуджаюць давер'я ў шырокіх колах і таму ня могуць разьлічаць на посьпех... Ёсьць шмат скаргаў на рэпрэсіі"...

У АПОШНІ ЧАС.

(Атрымана а 1 гадз. уночы).

СКАСАВАНЬНЕ СЬПІСКУ БЛЁКУ НАЦМЕНШАСЬЦЯЎ.

ВАРШАВА, 8-2. У Сьвянцянскім вокругу выбарчая камісія ануліравала сьпісак блёку нацыянальных меншасьцяй.

ЗАБОЙСТВА «ПРЫ ПАТАЙНЫХ АБСТАВІНАХ»

ВАРШАВА, 8-II. На паведамленьню «Кур'ера Паранняга» ў Вільні «пры патайных абставінах" забіт мясцовы ўпаўнаважаны блёку рабоча-сялянскага адзінства па выбарах у сойм Шэйэр. Забіты быў адным з выдатнейшых дзеячоў Віленшчыны.

АРЫШТЫ Ў СЛОНІМЕ.

ВАРШАВА, 8-II. У Слонімскім павеце (Віленшчына) арыштавана 12 чал. На словах «Кур'ера Поранняга», дзейнасьць арыштаваных выяўлялася ў распаўсюджаньні «перадвыбарнай камуністычнай літаратуры».

АРЫШТЫ УКРАІНЦАЎ У ЛЬВОВЕ.

ВАРШАВА, 8-II. Па атрыманых з Львову паведамленьнях, масавыя арышты ва Ўсходняй Галіцыі, якія на днёх адбываліся, знаходзяцца ў сувязі з маючымі адбыцца выбарамі ў сойм.

Львоўская паліцыя дае арыштам іншае тлумачэньне. Па запэўненьню паліцыі, яна атрымала весткі, быццам у сярэдзіне студзеня ў Данцыгу адбудзецца зьезд польскай кампартыі з удзелам дэлегатаў ад Усходняй Галіцыі; паліцыя запэўнівае, быццам учыненыя ёю на аснове гэтых вестак вобыскі далі «вялікія вынікі». Усяго арыштавана 12 чал.

Учора ў Львове паліцыя ўчыніла вобыск у памяшканьні украінскага нацыянальна-дэмакратычнага аб'яднаньня і ў рэдакцыях двух органаў УНДА «Дзіла» і «Грамадзкі Голас». Паліцыя захапіла шмат дакумантаў і арыштавала двох супрацоўнікаў «Грамадзкага Голасу».

АРЫШТЫ Ў ПЕРАМЫШЛІ.

ВАРШАВА, 7-II. Як паведамляе польская прэса, у Перамышлі (Усходняя Галіцыя) адбываюцца шматлікія арышты камуністаў.

АРЫШТЫ Ў ВІЛЬНІ.

ВАРШАВА, 6-II. У Вільні адбыліся мітынгі, прысьвечаныя памяці Леніна. Удзельнікі мітынгу былі разагнаны паліцыяй. Паліцыя ўчыніла шмат арыштаў.

АСУШКА ПОЛЬСКАГА ПАЛЕСЬСЯ.

«Голос Правды» паведамляе, што дэкрэтам прэзыдэнта польскай рэспублікі ўстаноўлена «Бюро мэліярацыі Палесься». Заданьнем яго будзе апрацоўка агульнага праэкту і каштарысу асушкі палескіх балот. Праэкт прадугледжвае асушку 10 паветаў Палескага ваяводзтва, 4—Валынскага, 2—Беластоцкага і 3—Навагрудзкага. Асушка павінна скончыцца праз 4 гады.

За дзень.

Ангельская камісія ў Індыі.

Ангельская камісія Саймона прыехала ў Індыю і прыступіла да «працы». Першыя вынікі прыезду ўжо сказаліся: тры забітых, сотні параненых і звыш 200 арыштаваных у галоўных гарадох Індыі—Бамбэі, Мадрасе і Калькуце.

Гэтак ангельскі імпэрыялізм ажыцьцяўляе сваё абяцаньне аб «уцягненьні індусаў» да вырашэньня пытаньня аб самакіраўніцтве Індыі! Як вядома, у камісію Сэймона не ўваходзіць ніводзін індус. Але затое сотні індусаў папалі ў астрог.

Бурнымі дэманстрацыямі пратэсту сустрэлі працоўныя Індыі прыезд ангельскай урадавай камісіі. Каленіяльнаму мілітарысцкаму ўраду «яго каралеўскай вялікасьці» пажадана было, каб на гэтых дэманстрацыях пралілася кроў. На вопыту Кітая ангельскаму імпэрыялізму павінна быць вядома, што гэткія падзеі дарма не праходзяць.

Яны будуць баявым хрышчэньнем для нацыянальна-рэвалюцыйнай і вызваленчай барацьбы ў Індыі. Яны, а аб гэтым ужо зараз можна сказаць, палажаць пачатак моцнага і небачанага яшчэ ў гісторыі Індыі падобнага ўздыму барацьбы.

Калі на гэтую барацьбу ўзьнімуцца шматмільённыя народныя масы Індыі, ангельскаму імпэрыялізму лёгка ня прыйдзецца.

Яго ня выратаюць ні бранявікі, ні аэрапляны, ні адзіны фронт з індыйскай буржуазіяй, з якой ужо зараз ангельскія імпэрыялісты працуюць у адным саюзе.

Рэвалюцыйны рух у Індыі знойдзе ў сябе досіць сілы для таго, каб зьнішчыць і каленіяльны гнёт ангельскай буржуазіі і сваіх уласных нацыянальных прыгнятацеляў.

Рост францускага мілітарызму і франка-нямецкія дачыненьні.

Француская палата дэпутатаў скончыла сэрыю ваенных законапраэктаў, зацьвердзіўшы закон аб аднагадовай службе ў францускай арміі, пачынаючы з 1930 году. Адкуль гэткі раптоўны лібэралізм і чаму французы пасьля таго, як яны правялі закон аб мілітарызацыі ўсёй нацыі ў выпадку вайны, знайшлі магчымым абмяжоўваць тэрмін службы?

Справа тлумачыцца проста; закон аб гадавой службе мае такія абмежаваньні, якія нямінуча зробяць яго немажлівым для ажыцьцяўленьня.

Закон набудзе моц толькі ў тым выпадку, калі да таго часу будзе набрана адпаведная колькасьць дабраахвотнікаў, якія згодзяцца служыць у арміі ня менш як 5 год і, такім чынам, цалкам пакрыюць страту. Да 1930 году павінна быць набрана звыш 200 тысяч наёмнага войска. Наўрад ці ўдасца гэтую колькасьць набраць. З другога боку, набор і адбор будуць рабіцца вельмі энэргічна. Такім чынам, закон аб гадовай службе пагражае зрабіцца адваротным: француская армія дзякуючы гэтаму закону толькі пашырыць свае кадры.

Француская армія павінна паступова ператварацца ў наёмную армію па ўзору ангельскай і дабраахвотнікі павінны выконваць ролю жандараў і наглядальнікаў у адносіне да маладых салдат, адбываючых вайсковую павіннасьць. Рэвалюцыйны настрой сярод навабранцаў і рэзэрвістаў зьяўляецца вельмі небясьпечным для францускага ўраду і можна спадзявацца, што закон аб гадовай службе зьяўляецца толькі прычынай для выхаваньня салдат-прафэсыяналаў.

Гэта тым больш мажліва, што апошняя прамова Брыяна аб францускай надворнай палітыцы і аб франка-нямецкіх дачыненьнях была сказана ў такім тоне, у якім звычайна пазваляў сабе гаварыць толькі Пуанкарэ. Каб праводзіць тую палітыку, аб якой гаварыў Брыян, трэба мець вялікую армію і армію, якая-б складалася калі ня цалкам, дык у значнай меры ні з рабочых і сялян, ненавідзячых вайну, а з наймітаў-прафэсыяналаў.

„Выбары" ў Зах. Беларусі.

Згодна з польскай канстытуцыяй і так званай «выбарчай ардынацыяй» ніхто з абвінавачаных у палітычных справах і нават пазбаўленых вольнасьці не пазбаўляецца права быць выбраным у сойм і сэнат. Пасьля выбараў пазбаўлены перад гэтым вольнасьці дэпутат сойму можа быць на запатрабаваньні сойму ці сэнату выпушчан з вастрогу і адказваць на судзе, як вольны чалавек.

У Польшчы ў хуткім часе пачнецца працэс „Бел. С.-Р. Грамады". Некаторыя з «грамадаўцаў» выстаўлены ў розных акругах Зах. Беларусі па выбарных сьпісках. Так, на Навагрудчыне выстаўлены кандыдатуры б. паслоў: Б. Тарашкевіча і П. Мятлы, а таксама і іншых, адбываючых арышты ў вастрогах б. «грамадаўцаў».

«Глос Правды»—лейб-орган „санацыйнай" пілсудчыны—пачаў ужо кампанію проці магчымасьці выбараў у дэпутаты сойму асоб, абвінавачаных у прыналежнасьці да «Грамады».

«Зьліквідаваная ў свой час Беларуская Грамада выступае—піша „Гл. Правды"—на абшарах Усходніх Зямель пад некалькімі фірмамі. А іменна: 1) «Беларускае Сялянска-Работніцкае Аб'яднаньне», 2) «Беларускія сяляне і работнікі» з Я. Станкевічам і жонкаю б. дырэктара бел. гімназіі Астроўскай на чале, 3) „Беларускі працоўны народ" з б. сэнатарам Уласавым на чале. У Навагрудзкай акрузе на сьпіску «Беларускага Сялянска-Работніцкага Аб'яднаньня» фігуруюць прозьвішчы б. паслоў: Б. Тарашкевіча, П. Мятлы і некалькіх іншых, якія цяпер сядзяць у вастрозе...

«З тае прычыны, што высунутыя на гэтым сьпіску асобы сядзяць у вастрозе,—сьпісак гэты зьяўляецца выразна правакацыйным»—піша «Глос Правды» і дадае, што сьпісак напэўна будзе ўняважнен, але што, прадбачваючы гэта, «грамадаўцы» падалі яшчэ адзін сьпісак «змаганьня за інтарэсы работнікаў і сялян».

Бліжэйшыя дні прынясуць нам весткі, як расправіцца санацыя з беларускімі выбарнымі сьпіскамі, ад якіх ня пахне польскай дэфэнзыўнай санацыяй і здрадніцтвам.

Зразумела, што трэба чакаць найгоршага.

У Саюзе ССР.

Пашырэньне 3-хпроц. броні для звольненага начскладу.

МАСКВА, 7-2. Увосені 1926 г. была выдадзена пастанова ўраду СССР аб 3-хпроцантнай броні пасад у установах для звальняемага з Чырвонай арміі начскладу. Да пачатку гэтага году агульны лік паступіўшых на цывільную службу ўжо дасягае 25.000 чал.

Зараз ужываюцца ўсе захады, каб да 10 гадавіны Чырвонае арміі канчаткова зьнішчыць беспрацоўе сярод начскладу, звольненага з РСЧА; для гэтае мэты 3 проц. броні распаўсюджана зараз ня толькі на каапэрацыйныя і грамадзкія прадпрыемствы, але і на прыватныя акцыянэрныя таварыствы.

Завоз тавараў у раёны.

МАСКВА, 7-2. Папярэднія даныя аб выкананьні плянаў завозу патрэбных тавараў, якія маюцца ў НК Гандлю, паказваюць у агульным здавальняючы ход дастаўкі тавараў раёнам. Значнае невыкананьне плянаў наглядаецца толькі па ваўняных тканінах і невялікае на скураных таварах і абутку. Нездавальняючае выкананьне гэнэральных угавораў у першыя два месяцы было выклікана дадатковаю дастаўкаю раёнам у кастрычніку. Дастаўка каапэратыўнай сыстэме за ўвесь квартал была выканана ў межах абумоўленых угаворамі нормаў.

НК Гандлю СССР прапанаваў наркаматам гандлю саюзных рэспублік устанавіць кантроль за станам дастаўкі на вёску газы. У выпадку перабояў трэба наладзіць расьсьледаваньне і прыцягваць вінаватых да судовае адказнасьці.

Рост грамадзкае актыўнасьці вучоных.

ЛЕНІНГРАД, 7-2. На абласной канфэрэнцыі вучоных выявіўся надзвычайны рост грамадзкае актыўнасьці сярод нядаўна яшчэ разьяднаных вучоных. На 8.100 членаў ленінградзкае сэкцыі прыпадае 600 прафсаюзных актывістаў, пераважна вучоных з выдатнымі прозьвішчамі. Вялікая праца праведзена вучонымі для ўзьняцьця культурнага ўзроўню рабочых. Толькі за два апошнія месяцы справаздачныя даклады вучоных сабралі 11.500 слухачоў.

Самасуд за забойства актывіста.

РАЗАНЬ, 8-II. У вёсцы Шаварды-наўцы, Разанскага павету, п'яны міліцыянэр Балашоў, які пагражаў сялянам зброяй, застрэліў старшыню сельсавету, камсамольца Пётру Ярмілава, які спрабаваў яго абяззброіць. Сяляне накінуліся на міліцыянэра і ўчынілі над ім дзікі самасуд, у выніку якога Балашоў забіты.

Камсамолец Ярмілаў быў лепшым у губэрні гаспадаром, грамадзкім працаўніком і актыўным селькорам губэрскае „вясковае газэты". Ярмілаў перавёў сваю вёску на 9-ціполку і завёў грамадзкі садовы рассаднік. Павадыры самасуду арыштаваны. Вядзецца дазнаньне.

Новыя местароды нафты.

УЛАДЫВАСТОК, 3-II. У прыморры ў басэйне рэчкі Імана выпайдзены местароды нафты. Нафта выходзіць наверх руднічкамі. У бліжэйшы час будзе наладжана навукова-прамысловая экспэдыцыя для спробнага бурэньня, устанаўленьня размераў плошчы і ўмоў распрацоўкі.

ПЛЯН ЗАГАТОВАК НЯ ВЫКАНАН.

Віцебская акруга выканала толькі 19,6 проц. гадавога заданьня.—Адстаюць таксама Магілёўская, Аршанская і Гомельская акругі.

Увага экспорту другарадных відаў тавару.

Павялічэньне таварнасьці сельскай гаспадаркі і адшуканьне новых відаў экспорту зьяўляецца зараз найважнейшым пытаньнем. Асаблівая ўвага аддаецца экспорту другарадных тавараў: яец, птушак, трусіных скурак і інш.

Наркамзем БССР пастанавіў сёлета арганізаваць у Менску, Віцебску і Гомелі 3 птушка-трусіныя заводы, на што будуць адпушчаны значныя сродкі.

Кожны такі завод мае быць арганізован у граніцах гарадзкой мяжы. Заводы ставяць сваёй задачай толькі быць пасрэднікам на распаўсюджваньні сярод насельніцтва гатунковай птушкі і трусоў.

На заводах будзе праводзіцца праз інкубацыю масавае выпладжваньне птушкі, якая будзе раздавацца на пэўных умовах сялянству.

Зараз вывучаецца пытаньне, скуркі якіх відаў трусоў найбольш маюць збыт заграніцай. Каб не залежыць поўнасьцю ад замежнага рынку, падымаецца пытаньне аб арганізацыі ў нас спэцыяльнай гарбарні трусіных скурак, а таксама вывучаюцца магчымасьці збыту выробленых скурак на ўнутраным рынку.

Белсельтрэсту выданы 5 тысяч руб. на набыцьцё гатунковай птушкі ў Даніі і Нямеччыне.

Вынікі хлебазагатовак да 1-га лютага.

ВІЦЕБСК, 8-2. За час з 1 ліпеня да 1 студзеня ў акрузе было загатоўлена ўсімі арганізацыямі 92 тоны розных хлебных прадуктаў, а ў працягу студзеня—398 тон. Згодна пляну, Віцебшчына павінна за год загатовіць 2500 тон. Такім чынам, выканана ўсяго 19,6 проц. гадавога пляну.

МАГІЛЕЎ, 8-2. З пачатку загатоўчай кампаніі да 1 студзеня ў акрузе загатоўлена розных хлебных культур 888 тон, а ў студзені—421 тона. Такім чынам, дагэтуль выканана толькі 20,7 проц. гадавога заданьня.

ВОРША, 8-2. З 1-га ліпеня 1927 году да 1 студзеня 1928 году ў акрузе праз усе арганізацыі загатоўлена 449 тон хлеба. У студзені загатоўлена 535 тон, а з пачатку кампаніі да 1-га лютага—984 тоны розных хлебных культур, ці 22,5 проц. гадавога пляну.

ПОЛАЦК, 8-2. Да 1-га лютага ў акрузе загатоўлена рознага збожжа 490 тон, з іх 186 тон у студзені. За ўсю хлебазагатоўчую кампанію гадавое заданьне выканана на 54,5 проц.

ГОМЕЛЬ, 8-2. З пачатку кампаніі да 1-га студзеня загатоўлена рознага збожжа 1538 тон, з якіх 1300 тон—у студзені месяцы. Гадавое заданьне выканана ўсяго на 25,4 проц.

МАЗЫР, 8-2. Ад 1-га ліпеня да 1-га кастрычніка 1927 г. у акрузе загатоўлена 26 тон хлеба, у першым квартале бягучага гаспадарчага году—183 тоны і ў студзені—174 тоны. Усяго загатоўлена 383 тоны розных хлебных культур, што складае 23,9 проц. гадавога пляну.

БАБРУЙСК, 8-2. Усімі арганізацыямі акругі загатоўлена хлеба 3046 тон, з якіх 1102 тоны загатоўлена ў студзені. Гадавое заданьне выканана на 27 проц.

МАГІЛЬНЯНЫ, 2-II. За апошнюю дэкаду студзеня мясцовае спажывецкае таварыства загатовіла 5257 кгр. хлеба і на 380 руб. рознай сыравіны. Прывоз хлеба і сыравіны сялянамі не сьмяншаецца.

«БЕЛАРУСКІ ЛАРОК» ЗАГАТОВІЎ 76 ТОН ЗБОЖЖА.

Працоўны калектыў «Беларускі Ларок» вядзе ўзмоцненую загатоўку збожжа. Да апошняга часу ім загатоўлена 76 тон рознага збожжа.

Колькі загатоўлена сыравіны ў студзені.

Водлуг даных Нар. Кам. Гандлю, у працягу студзеня загатоўлена: мяса—1090 тон, пянькі—50 тон, шчаціны—54 тоны, конскага воласу—12 тон і пушніны—183 тоны. Асабліва слаба стаіць справа з загатоўкай пянькі, заданьне па якой да 1-га лютага выканана толькі на 21,5 проц.

МАГІЛЁЎ, 8-II. (Па тэлеграфу). Праз сыстэму сельска-гаспадарчай каапэрацыі загатоўлена па акрузе ў студзені 134 тоны лёну, з іх 54 тоны па контрактацыі.

У студзені Белдзяржгандаль загатовіў рознай сыравіны на 667.000 рублёў, што складае 35 проц. квартальнага пляну.

За гэты ж час Белдзяржгандаль экспартаваў заграніцу рознай сыравіны на 534.276 руб.

Прамысловыя тавары для вёскі.

Нар. Кам. Гандлю прыняў меры да ўзмацненьня забясьпечаньня прамысловымі таварамі вёскі.

Так, у першай дэкадзе студзеня для сельскіх мясцовасьцяў было завезена 5 вагонаў баваўнянай мануфактуры. За першую ж дэкаду лютага завезена ўжо 12 вагонаў мануфактуры. Апрача гэтага, выдзелена на 25.000 руб. суконна-шарсьцяных тавараў, якіх у студзені зусім ня было адпушчана.

Загатоўкі растуць.

(м. Смалявічы, Менск. акр.).

З паловы студзеня наша каапэрацыя раскачалася і ўзялася за загатоўчую працу. У выніку гэтага Смалявіцкае спажывецкае т-ва «Зорка» да апошняга часу зрабіла значныя посьпехі. Так, ім загатоўлена жыта—2670 пуд., пшаніцы—518 пуд., аўса—1708 пуд., ячменю—1237 пуд., іншага збожжа—104 пуды, агулам—623 пуды збожжа, што складае 80 проц. заданьня на квартал студзень—сакавік.

Пазьней раскачалася Смалявіцкае с.-г. т-ва, якое да 1-га лютага загатовіла: жыта—400 пуд., аўса—275 п., ячменю—61 пуд. і 173 штукі скураной сыравіны.

Паявая кампанія па гэтым т-ве дала паступленьне ў 237 руб., што далёка невыстарчальна. Праўленьню гэтага т-ва неабходна падцягнуцца. С.

Ёсьць дасягненьні.

ПОЛАЦАК, 8-II. (Ад ул. кар.). За апошнія 10 дзён загатоўлена: жыта 49 тон, вікі—44 тоны, аўса—26 тон, ячменю—12 тон, пушніны—на 11067 р., лёну-валакна—97 тон, ільнянага семя—18 тон і рыбы—на 18000 руб.

Асабліва ажывілася загатоўка хлеба-прадуктаў пасьля таго, як на раёны былі пасланы таварышы для ўзмацненьня загатовак. Так, за 1-ы квартал розных хлебапрадуктаў было загатоўлена 22 тоны, а за студзень—162 тоны.

Значна ўзрастае загатоўка другарадных відаў сыравіны. За паказаныя 10 дзён рызьзя загатоўлена на 969 руб., конскага воласу—на 931 руб., журавін—на 3488 руб., пушніны—на 5856 руб.

За нядбайнасьць у працы—пад суд.

Полацкі Акруговы Суд 1 га лютага г. г. разабраў справу старшыні Полацкага Цэнтр. Рабочага Каапэратыву Лазара Крэйніна і статыстыка таго-ж каапэратыву Сымона Капелёвіча, якія абвінавачваліся ў службовай нядбайнасьці—несвоечасовым прадстаўленьні зьвестак аб працы каапэратыву за II, III і IУ кварталы.

Суд прыгаварыў—Капелёвіча Сымона і Крэйніна Лазара да пазбаўленьня волі з суровым адмежаваньнем тэрмінам на адзін год, без пазбаўленьня правоў, але знайшоў магчымым скараціць пакараньне: Крэйніну абвесьціць грамадзкае зьневажаньне, а Капелёвічу—скараціць зьняволеньне да 6 месяцаў бяз суровага адмежаваньня.

Страхавыя плацяжы павінны паступіць у тэрмін.

У паступленьні акладных страхавых плацяжоў па БССР за другую палову студзеня ёсьць нязначнае палепшаньне. Так, за гэты час паступіла нядоімкі і акладу па ўсіх відах сельскага акладнога страхаваньня 597.000 руб., ці 14,2 проц. налічаных сум.

З пачатку акладнога году паступіла нядоімкі і акладу 2.479.000 руб., што складае 58,8 проц.

Бабруйская акруга адстала.

Хоць наогул па БССР ёсьць нязначнае палепшаньне ў сэнсе паступленьня страхавых плацяжоў, але ў асобных акругах справа стаіць вельмі дрэнна. Бабруйская акруга, якая ўвесь час пасьпяхова зьбірала плацяжы і займала 3-е мейсца па БССР, цяпер значна адстала: за другую палову студзеня сабрана ўсяго 10,9 проц., гэта ў той час, калі, напрыклад, па Віцебскай і Менскай акругах паступіла 18 проц. Такі значны недабор па Бабруйшчыне (300.000 руб.) стварае пагрозу акладной кампаніі ў гэтай акрузе, і неабходна прыняць тэрміновыя меры да ўзмацненьня збору акладу і, галоўным чынам, да спагнаньня нядоімкі.

У Полацкай акрузе сабрана толькі 11 проц.

Пагражаючае становішча з акладной кампаніяй у Полацкай акрузе, якая за другую палову студзеня сабрала 11 проц. налічаных сум. Тутналаўны зрыў акладной кампаніі. У мінулым годзе гэта акруга займала першае мейсца, з пачатку кампаніі займала адно з першых месц, а цяпер яна дакацілася да прадапошняга месца.

Гэта сьведчыць, што дадзеныя ўрадам дырэктывы Полацкую акругу не закранулі, і паступленьне з кожным днём пагаршаецца.

Мазырская акруга пляцецца ў хвасьце.

Мазырская акруга, як вядома, пляцецца ў хвасьце: сабрана ўсяго 51,8 проц. налічаных сум. Калі раней дрэннае паступленьне па гэтай акрузе яшчэ было цярпіма, дык цяпер гэтаму ніякага апраўданьня няма, бо сялянства Мазыршчыны мае даход ад лесараспрацовак, і належныя страхавыя плацяжы выплаціла-б, каб на гэта была зьвернута адпаведная ўвага з боку мясцовай улады; як відаць, па Мазырскай акрузе нічога ня зроблена. Тут, бязумоўна, ёсьць нядбайнасьць райвыканкомаў і сельсаветаў, якіх неабходна прыцягнуць да адказнасьці.

Магілёўская і Аршанская акругі сьпяць.

Таксама няма належнага зруху ў зборы ў Магілёўскай і Аршанскай акругах, у якіх за другую палову студзеня паступіла ўсяго 10 проц. налічаных плацяжоў. Вядома, што пры такім тэмпе паступленьня, калі па Магілёўскай акрузе недабор складае 300000 р., а па Аршанскай—223000 руб., акладную кампанію скончыць да тэрміну немагчыма.

Прыходзіцца адзначыць, што некаторы пералом ёсьць у паступленьнях па Віцебскай і Менскай акругах, але гэта ўсё-ж недастаткова, бо да канца кампаніі (29 лютага) засталося ўсяго 3 тыдні, часу зусім мала, а недабор па БССР складае 1730000 р.; аб гэтым трэба падумаць.

Нават у тых акругах, дзе ёсьць некаторае палепшаньне, нельга віяк аслабіць тэмп паступленьня, а неабходна больш рашуча праводзіць спагнаньне.

Вінаватых у зрыве кампаніі—пад суд.

Апошнім акругам, дзе паступленьне ідзе дрэнна (Мазырская, Полацкая, Аршанская, Бабруйская) трэба зараз высьветліць віноўных у зрыве паступленьня страхавых плацяжоў і прыцягнуць іх да судовай адказнасьці.

Такое становішча ў далейшым ня можа быць цярпіма. Дырэктывы дадзены, іх неабходна выканаць. Цягнуць далей з акладной кампаніяй нельга. Да 1 сакавіка павінны быць спагнаны ўсе 100 проц. страхавых плацяжоў.

Важнейшы крок.

Справа распаўсюджаньня газэт і прасоўваньня ў гушчы рабочых і сялян кніжкі заўсёды займала адно з першых месц у працы партыі і савецкай улады. Дэрэктывы ў гэтым напрамку даваліся зусім ясныя і не патрабуючыя ніякага тлумачэньня. Кожны партыец і кожны сьвядомы грамадзянін павінен быў, здавалася-б, добра ведаць свой абавязак у галіне справы распаўсюджваньня як партыйнай, так і непартыйнай літаратуры і выконваць іх.

Ці маем мы гэта на справе?

На жаль, трэба сазнацца, што мы гэтага ня маем ня толькі поўнасьцю, але ня маем нават і ў самым нязначным процанце. На вялікі жаль, ня толькі сьвядомае грамадзянства наогул, але і адказныя працаўнікі, якія беспасрэдна зацікаўлены ў справе распаўсюджваньня літаратуры, у справе падняцьця культурнага ўзроўню сялянства, у справе, нарэшце, павялічэньня тыражу сваіх выданьняў, а значыцца і павялічэньня даходу ад гэтых выданьняў—мала аддаюць увагі справе распаўсюджваньня газэт і кніжак. Наадварот, мы маем цэлы шэраг такіх зьявішч, калі з боку мясцовых працаўнікоў, якія па сваёй пасадзе павінны былі-б прыняць усе захады да пашырэньня падпіскі на газэты, да пашырэньня прасякненьня кніжкі ў гушчы сялянства—адносяцца да гэтага чыста фармальна, пабюракратычнаму.

Цяпер, калі справа культурнай рэвалюцыі высоўваецца на першы плян, калі XV зьезд партыі сказаў сваё рашучае слова па гэтаму пытаньню—кожны партыец, кожны сьвядомы савецкі працаўнік і кожны сьвядомы грамадзянін павінен запытацца ў сябе: а што ён зрабіў для справы культуры, што ён зрабіў для справы прасоўваньня ў гушчы рабочых і сялян нашай літаратуры, якая фактычна зьяўляецца адным з першых крокаў па шляху культурнай рэвалюцыі?

Мала знойдзецца такіх, якія з задавальненьнем могуць даць станоўчы адказ на гэта запытаньне. Большасьць скажа, што яны зрабілі мала, а частка павінна будзе сказаць, што нічога не зрабіла.

Справа культурнай рэвалюцыі, справа прасоўваньня газэты і кніжкі ў працуючыя масы—заняла цяпер першае месца, і кіраўнічыя ўстановы партыі і савецкай улады падыходзяць да гэтага пытаньня зусім шчыльна і рашуча. Пытаньне аб распаўсюджваньні газэт і кніжак, аб усіх хібах і недахватах у гэтай справе высьвятляецца цяпер праз спэцыяльна вылучаных таварышоў, якія выяжджаюць у акругі. Само сабой зразумела, што праца гэтых таварышоў і карыснасьць яе будзе залежыць ад таго, наколькі мясцовыя працаўнікі прасякнуцца ідэяй неабходнасьці падняцьця культурнага ўзроўню нашага, яшчэ малапісьменнага, а часам і зусім няпісьменнага, сялянства, наколькі яны зразумелі дырэктывы партыі наконт культурнай рэвалюцыі, наколькі яны самі жадаюць і імкнуцца да гэтай культурнай рэвалюцыі.

Гэта абсьледваньне—важнейшы крок у справе пашырэньня падпіскі на газэты, у справе прасоўваньня кніжкі на вёску, у справе культурнай рэвалюцыі.

І. Шыпіла.

СЯЛЯНЕ в. НАРЦЫЗАВА і пас. ЛІЦЬВІНАЎКА ПАДПІСАЛІСЯ НА ЎСЕ 100 проц.

Мы зразумелі задачы нашай улады.

ВОРША, 8-II. (Ад ул. кар.). Сяляне з кожным днём усё больш разумеюць пастаўленую дзяржаўнай задачу аб узмацненьні сялянскай гаспадаркі.

А вось яскравыя прыклады гэтага.

Сяляне Талочынскага раёну—в. Нарцызава і пасёлку Ліцьвінаўка падпісаліся на ўсе 100 проц.—на 67 р. 50 к.; в. Камяніца, Майдаі і Н. Яблакна—на 127 р. 50 к.; в. Зацішша, Калытава і Сырца—на 72 р.; в. Зарславені ў колькасьці 40 падпішчыкаў падп. на суму 100 р.; в. Н. Будаўка—на 47 руб.

Слухачы Цяцерынскай вячэрняй школы (Кругл раён.) падпісаліся на 20 руб.

Вучні Берасьценаўскай школы сял. моладзі (Арш. раён) разам з настаўнікамі школы падпісаліся на 150 руб.

Сярод сялянства школа распаўсюдзіла пазыкі на 130 руб.

— Мы зразумелі задачы нашай улады,—заяўляюць сяляне Аршаншчыны.

Жанчыны—за ўзмацненьне гаспадаркі.

Дэлегаткі Узьдзенскага дэлегацкага пункту на сваім агульным сходзе ад 5 лютага аднагалосна пастанавілі ўсім дэлегаткам падпісацца на пазыку ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі.

На сходзе прысутнічала 21 дэлегатка.

З іх у першую чаргу падпісаліся на 5-рублёвыя аблігацыі: Прудпік Ніна, Махнач Ганна, Клочка Стася і Каплан Роза, а 17 дэлетак падпісаліся на аблігацыі коштам у 2 р. 50 кап.

Тут-жа на сходзе было ўцягнута ў падпіску на пазыку 30 жанчын недэлегатак.

Камсамол—на першым месцы.

БАБРУЙСК, 8-II. (Ад ул. кар.). Гарадзецкая камсамольская ячэйка распаўсюдзіла сярод сялян сельсавету аблігацый пазыкі на 650 руб. Самі камсамольцы падпісаліся на 90 руб.

Ужо рэалізавана на 3000 руб.

БАБРУЙСК, 8-II. (Ад ул. кар.). Падрыхтоўка да рэалізацыі пазыкі распачалася з 20 студзеня. Утвораны раённая і вясковыя камісіі.

З гораду ў вёскі накіраваны 24 таварышы для растлумачэньня важнасьці пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі.

Папулярызацыя пазыкі праводзіцца шырока. Пачалася падпіска. Ужо рэалізавана аблігацый пазыкі на 3000 руб.

Распаўсюдзілі аблігацый на 2000 руб.

ВОРША, 7-2. (Ад ул. кар.). З кожным днём усё шырэй і шырэй разгортваецца кампанія па рэалізацыі пазыкі замацаваньня сялянскай гаспадаркі ў Копыскім раёне.

У раёне прыцягнута да распаўсюджаньня пазыкі 60 контрагентаў; да апошняга часу распаўсюджана аблігацый на 2000 руб.

Контрагентамі працуюць настаўнікі, загадч. хат.-чытальнь, працаўнікі с.-с., КСУ і, наогул, вясковы актыў.

Копыская прафарганізацыя аднагалосна пастанавіла падпісацца на пазыку ўсім, а таксама шырэй разгарнуць працу па прыцягненьні таварышоў да распаўсюджаньня пазыкі.

Практычныя шляхі беларусізацыі.*)

Палітыка царскага ўраду у справе культурнага развіцьця на беларускіх абшарах была: забарона карыстацца беларускай мовай ва ўстановах, забарона адчыняць беларускія школы, друкаваць кніжкі на беларускай мове і г. д. Царскі ўрад ня толькі ня лічыўся з нацыянальнымі асаблівасьцямі нашае беларускае насельнасьці, але зусім адкрыта сваёй салдафонскай палітыкай імкнуўся як мага больш сьцерці гэтыя асаблівасьці. «Чым горай пароду, тым лягчэй ураду»,—гэты дэвіз асабліва ўжываўся ўрадам на Беларусі. Царскі ўрад імкнуўся насадзіць агіду да беларускае мовы, як да мовы хамскай, мужыцкай. І зусім ня дзіва, што мы зараз на Беларусі маем на 1000 чалавек насельніцтва 673 няпісьменных. Тую школу, якую царскі ўрад нават і дазволіў у Беларусі, не магла задаволіць беларускага селяніна, бо для яго была незразумела мова, на якой там выкладалі. Беларускія дзеці выходзілі са школы няпісьменнымі, і такім чынам, нават тая невялічкая школьная сетка вялікай карысьці Беларусі не дала, апроч таго, што псавала дзяцей.

Савецкая Беларусь грунтоўна зьмяніла стасункі ў школьнай справе. У лютым 1921 году ЦВК БССР ухваліў пастанову аб тым, што пераважная большасьць нашых школ павінна быць пераведзена на беларускую мову. Праца была вельмі цяжкая. З нічога, бо ўсе школы былі разбураны імпэрыялістычнай і грамадзянскай вайной, трэба было стварыць новую школу, якая-б магла абслугоўваць нашых дзяцей, а таксама ліквідаваць няпісьменнасьць сярод дарослага насельніцтва.

Дыктатура пралетарыяту адчыніла беларускаму народу шлях да свайго культурнага развіцьця. І трэба адкрыта сазнацца, што ў гэтай справе ў нас посьпехі сапраўды вялізарныя. Мы зараз маем больш 4.000 школ, якія працуюць выключна на беларускай мове, распаўсюджваюць асьвету ў самых глухіх кутках нашае краіны. Выкладаньне на роднай мове ажывіла школу, стварыла ёй новыя ўмовы, якія яна ніколі ня мела і мець ня можа пры капіталістычным ладзе. Насельніцтва прыблізілася да школы, зацікавілася ёю, будуе яе, стварае ёй патрэбныя ўмовы,—бо яна яму родная. Беларусізаваная ня толькі першапачатковая школа, але таксама і сямёхгодка. 66,6 пр. сямёхгодак у 1926-27 годзе працавалі пабеларуску. Мы наблізілі да беларускага насельніцтва ня толькі ніжэйшую, але сярэднюю і вышэйшую асьвету. Мы пераходзім на ўсеагульнае навучаньне. Ня трэба доўга даказваць, што толькі савецкая сыстэма дзяржаўнасьці дала нам гэтую магчымасьць. Але мы ня можам заспакоіцца на маючыхся дасягненьнях. Пакуль праца не даведзена да канца, мы ня маем права крычаць пераможнае «ура». Мы маем цэлы шэраг момантаў, якія яшчэ прыцягваюць да сябе нашую ўвагу і сыгналізуюць некаторую небясьпеку ў сэнсе магчымага адступленьня назад. Напрыклад, у 1924-25 г. мы мелі беларускіх чатырохгодак 93,6 проц. агульнага ліку, у 1925-26 г. гэты лік нязначна зьнізіўся—93,5, а ў 1926-27 г. ужо 83,3 проц. *) Гэтае адноснае зьмяншэньне адбылося пры ўмове іх колькаснага павялічэньня. Праўда, тут мусіць крыху ўплывае далучэньне да сыстэмы Наркамасьветы Беларусі значнай часткі расейскіх школ з Гомельшчыны, але ўсё-ж гэткі процант зьмяншэньня занадта вялікі. Яшчэ горш у нас справа з сярэдняй школай. Сямёхгодак у 1924-25 г. было—69,6 беларускіх, у 1925-26—75,6, а ў 1926-27—66,6 пр. Беларускае дзіцё сярэдняй школай абслугоўваецца менш, чымся дзеці іншых нацыянальнасьцяй. Беларуская школа, бо яна маладая, абсталявана горш іншых школ.

Гэта значыць, што ў справе беларусізацыі нашай школы справы яшчэ ня ўсе ў парадку. Процант школ, якія праводзяць навучэньне на родных мовах, яшчэ ў поўнай меры не адпавядае колькасьці насельніцтва гэтае нацыянальнасьці ў нашай дзяржаве.

І яшчэ, што нам трэба было дадаць да пастановы Прэзыдыуму Савету Нацыянальнасьцяй ЦВК СССР: пасьпешны вопыт беларусізацыі школ у БССР павінен таксама распаўсюджвацца на беларускіх дзяцей, якія жывуць у РСФСР. Мы мелі шмат выпадкаў, калі беларускія дзеці прымежных вёсак Смаленшчыны прыходзілі да нас у Калініншчыну вучыцца; бацькі тлумачылі гэта тым, што дзеці лягчэй навучаюцца пісьменнасьці пабеларуску, чым парасейску. Гэткіх фактаў было шмат.

Больш таго, нам прыходзілася сустракацца з фактамі, калі ў мясцовасьцях Гомельшчыны, у якіх нам на перапісу 1926 году паказалі колькасьць беларусаў у 5-8 процантаў, там з 1924 і 25 году існавалі беларускія школы. Зусім іншая рэч, што гэта ставіць пад сумненьне вынікі перапісу ў гэтай мясцовасьці, але гэта не ўваходзіць тут у нашую тэму. Мы тут толькі хочам падкрэсьліць вялікі зрух у настроях беларусаў за час рэвалюцыі, што дзе-б яны ні былі, яны шукаюць школу на роднай мове. Гэта таксама датычыцца і беларускага насельніцтва ў Сібіры, дзе, паміж іншым, справа з беларускай школай пастаўлена дужа дрэнна.

Зусім значныя посьпехі мы маем у справе вышэйшай асьветы. Беларусь, якая пры царызьме ня мела ніводнай вышэйшай навучальнай установы, зараз мае Дзяржаўны Унівэрсытэт, Сельска-гаспадарчую Акадэмію, Вэтэрынарны Інстытут і Камуністычны Унівэрсытэт. Значна пашыралася сетка іншых галін прафтэхнічнае асьветы. Але мы тут мусім адзначыць, што выкладаньне ў нашых вышэйшых навучальных установах нас ні ў якой меры не здавальняе. Беларускі вучань, скончыўшы беларускую сямёхгодку, уступаючы, напрыклад, ва ўнівэрсытэт, прымушан сваю родную мову пакласьці ў шафу, як кажуць, да лепшых часоў, і пачаць вывучаць і карыстацца расейскай мовай.

Беларусізацыя ў прафэсыянальных школах, тэхнікумах і ВНУ праходзіць занадта марудна. Агульны тэмп нашага росту і будаўніцтва ідзе куды больш шпарка. Наогул, ня можна ставіць пытаньне гэтак, што родная мова студэнцтва павінна быць і мовай тэй ці іншай навучальнай установы. Унівэрсытэт, тэхнікум, інстытут павінны даць працаўнікоў, галоўным чынам, для Беларусі, для працы сярод нашага беларускага насельніцтва. Каштоўнасьць выпушчаных Беларускім Унівэрсытэтам 273 пэдагогаў, 130 юрыстаў, 125 эканамістаў і 170 дактароў значна зьніжаецца, бо яны ня ведаюць мовы таго насельніцтва, сярод якога ім прыйдзецца працаваць. Больш таго, мы ставім пад вялікае сумненьне нават якасьць праведзенай працы па беларусізацыі ВНУ, бо першыя выпускі Унівэрсытэту, возьмем хоць-бы пэдагогаў, якія скончылі беларускую сэкцыю, паказалі на вопыце сваю слабую падрыхтаванасьць для практычнай працы. Мы занадта мала вымагаем ад нашых студэнтаў, заканчваючых Унівэрсытэт. Можа гэта тлумачыцца тым, што не пасьпеў студэнт сайсьці са школьнай лаўкі, а ў яго ўжо вялікі вопыт, але гэта не дазваляе нам выпускаць калек, каб яны і дзяцей калечылі. Справа практыканства, стажорства ў нас пастаўлена вельмі слаба, павярхоўна і няглыбока. На справу падрыхтоўкі беларускага спэцыяліста, беларускага аграному, настаўніка, каапэратара, трэба зьвярнуць куды больш увагі, чым гэта было дагэтуль.

Як і ў справе беларусізацыі апарату, гэтаксама і ў справе адукацыі ня можна задаволіцца беларусізацыяй па справаздачных процантах. Хіба сапраўды можна зваць беларусізацыяй выданьне юбілейных кніжак Беларускага Унівэрсытэту і Беларускай Дзяржаўнай Сельска-Гаспадарчай Акадэміі, прысьвечаных дзесяцігодзьдзю Кастрычнікавай рэвалюцыі? Чамусьці нашыя вышэйшыя навучальныя ўстановы да юбілею Кастрычніка не змаглі выдаць нічога больш саліднага, апроч брашурак з газэтных артыкулаў у 32 старонкі. Гэта зусім іншая рэч. Але навошта гэта трэба друкаваць са шматлікімі памылкамі на кожнай старонцы, гэта ўжо зусім незразумела. Няўжо-ж для гэтага мы беларусізуем навучальныя ўстановы, каб яны няпісьменна навучалі нашу моладзь?

Ці возьмем другі прыклад. Адзін высокапаважаны стары расейскі настаўнік у рабфаку БДУ ў Менску паставіў на галасаваньне курсантаў пытаньне, на якой мове яму выкладаць: парасейску ці пабеларуску. Сьмеху варта такая беларусізацыя, калі любы настаўнік Унівэрсытэту яшчэ ставіць яе на галасаваньне. Настаўнік аказаўся настолькі аўтарытэтным, што зрабіў жаданы яму ўплыў на курсантаў, і яны большасьцю галасоў прагаласавалі за расейскую мову. Вось табе і беларусізацыя, пляц, пастановы партыі, ураду і г. д. Ці хіба можна назваць беларусізацыяй, калі асыстэнт, выкладаючы права, расказвае студэнтам анэкдоты аб беларусізацыі! Не, паважаныя асыстэнты, выкладчыкі, прафэсары і акадэмікі, гэтак мы з беларусізацыяй далёка з вамі не паедзем. Мы ўжо дарасьлі да таго ўзросту, што маем права ад вас вымагаць куды больш. Сёньня нас ужо не здавальняе фармальная беларусізацыя БДУ на 31 проц., Акадэміі на 20 проц. і Вэтэрынарнага Інстытуту на 1,6 проц. Наконт Вэтэрынарнага Інстытуту гэта выходзіць крыху нават анэкдатычна. Няўжо-ж там рыхтуюць вэтэрынараў толькі для расейскай часткі нашага насельніцтва? Ці можа і там прытрымліваюцца пункту погляду таго бабруйскага вэтэрынара, які казаў, што «яго пацыенты пабеларуску не гавораць»?

Пастановы ЦВК СССР і БССР кладуць канец гэтаму пытаньню. Няможна дазволіць, каб любы выкладчык па свайму жаданьню мяняў і парушаў пляны, вызначаныя ўрадам. Разам з намі Прэзыдыум Савету Нацыянальнасьцяй ЦВК СССР адзначае «слабы тэмп беларусізацыі ВУЗ'аў і часткі сярэдніх школ прафтэхнічнае асьветы».

Нам трэба выразна акрэсьліць гэтае пытаньне. Калі нам гавораць, што вы асьвету кожнаму даеце на роднай мове, а таму дайце нам унівэрсытэты і г. д. таксама на роднай мове, дык гэта бяссэнсіца. Мы забясьпечваем нацыянальнымі сэкцыямі больш шматлікія нацыянальнасьці ў БССР, але агульнае выкладаньне павінна праводзіцца на мове тых масаў, якіх скончыўшыя студэнты ў будучым будуць абслугоўваць. Інакш пытаньне ставіць няможна, адгаварвацца аб'ектыўнымі спэцыфічнымі і іншымі ўмовамі няможна. Спэцыфічныя ўмовы Савецкай Беларусі якраз тое, што тут жывуць у пераважнай большасьці беларусы, а таму нам патрэбны аграномы, каапэратары, юрысты, дактары, прафэсары, якія-б гаварылі пабеларуску і ведалі нашыя эканамічныя і бытавыя асаблівасьці. Пакуль гэтага не зразумеюць тыя, каму гэта ведаць трэба, мы вялікіх посьпехаў мець ня можам. Мы праводзім вялікую працу па каапэраваньню насельніцтва, мы праводзім вялізарную каапэрацыйную прапаганду, мы растлумачваем селяніну, што каапэрацыя—шлях да сацыялізму, што мы павінны перабудаваць нанова ўсю нашую сельскую гаспадарку, а наш каапэратар, спэцыяліст, скончыўшы наш Віцебскі каапэрацыйны тэхнікум, нават ня можа нашаму селяніну гэта растлумачыць, бо ня ведае яго мовы. На што гэта патрэбна? Навошта нам тады свой тэхнікум трымаць, ужо больш таньней было пасылаць студэнтаў вучыцца ў РСФСР. Гэткае самае становішча з Полацкім лясным тэхнікумам, Мар'іна-Горскім агародніцкім тэхнікумам, Беліцкай і Смалянскай сельска-гаспадарчай школай і г. д.

Наша савецкая грамадзкасьць як сьлед яшчэ не зацікавілася гэтым пытаньнем. Мы вядзём барацьбу за новага чалавека, мы падкрэсьліваем, што ў нашых умовах праблема культурнай рэвалюцыі гэта, галоўным чынам, праблема сялянская і ў гэты самы час як сьлед не ўявілі сабе, як да гэтага сялянства падыйсьці трэба. Трэба перавыхаваць нашыя культурніцкія і інтэлігенцкія кадры ў напрамку разуменьня, што культурная рэвалюцыя ў Беларусі—гэта ёсьць праблема нацыянальнай культуры, праблема ўзьняцьця беларускага селяніна на больш высокі культурны ўзровень.

(Канец будзе).

Ч. Шах.

*) Усе лічбы, якія падаюцца ў гэтым артыкуле, узяты з кніжкі „Практическое разрешение национального вопроса в Белорусской Социалистической Советской Республике" часть I „Белоруссизация", выдадзенай Цэнтральнай Нацыянальнай Камісіяй ЦВК БССР да дзесяцігодзьдзя Кастрычнікавае рэвалюцыі.

*) Пачатак глядзі „Сав. Бел." № 33.

Жыцьцё і праца асьветніка.

Калдагаворная кампанія па саюзу працасьветы праходзіць ненармальна—назіраюцца выпадкі парушэньня правоў асьветнікаў.

У гэтым годзе значная частка школ застаецца без апалу. Трэба падрыхтавацца, як належыць, да наступнага навучальнага году.

„Зацьвердзілі" калдагавор.

З усіх куткоў **Чырвонаслабодзкага раёну** паўзуць асьветнікі на свой раёнавы сход.

Ды і як не паўзьці—сёньня вырашаецца самая жыцьцёвая справа:—зацьвярджаецца калектыўны дагавор з райвыканкомам.

За ўзор узят прыкладны дагавор, які прыслала акруга. Але да гэтага ўзору дадаюцца папраўкі, таксама досыць «узорныя».

Звычайна тып новыя дагаворы грунтуюцца на кадэксе законаў аб працы і зьяняюць іх у бок нагоршаньня ўмоў працоўных не дазваляецца.

Але ёсьць-жа катэгорыя людзей, для якіх закон ня пісан. Да такой катэгорыі мімаволь трэба аднесьці, як раённую адміністрацыю, так і раённую прафсаюзную арганізацыю Чырвон слабодзкага раёну.

І вось адміністрацыя, пры поўным падтрыманьні саюзу, уносіць пункцік **«Звальняць непадыходзячых працаўнікоў не пазьней, чым за месяц да пачатку летніх канікул»**. (Чытай—каб не плаціць за летнія месяцы).

Другая папраўка: «Адміністрацыя можа выклікаць працаўніка па службовых справах на-за межы раёну школы і за фурманку не аплачваць, да 12 разоў у год».

Іначай кажучы, настаўнік павінен будзе аплачваць фурманку за свой кошт.

Галасуюць.

Супроць папраўак 18 чал. (самых сьмелых), за папраўку—23 чал. і ўстрымалася—19 (чытай—супроць, але сьмеласьці не хапіла).

Праўда, знайшоўся адзін член саюзу, які прапанаваў запісаць асобную думку, да яго далучыліся яшчэ 12 ч.

Але гэта асобная думка не спадабалася... Каму-б вы думалі? Прафунаўнаважанаму К. і К-о.

Ён з абурэньнем выступіў і заявіў—усім тым хто ўносіць асобныя думкі ня месца ў саюзе, працануюю асобную думку не запісваць.

Галасуюць.

Чалавек 5 знайшліся і начальства падтрымалі, астатнія ўстрымаліся:—каму-ж прыемна быць выкінутым з саюзу, шмат прасьцей быць нэйтральным.

(Таварышы чырвона-слабодзцы, дазвольце давесьці да вашага ведама, і надалей вы гэта памятайце, што кожны ўдзельнік, або група ўдзельнікаў, любога сходу і пасяджэньня маюць поўнае права запісваць у пратакол свае асобныя думкі бяз усякага галасаваньня).

Адным словам, аб асьветніцкім дабрабыце ў Чырвона-Слабодзкім раёне клапоцяцца не накладаючы рук і райвыканком і мясцком.

Памаўзьлівы.

Бабруйшчына.

Аб апале для школ трэба падумаць загадзя.

Аб тым, што многія школы ў гэтым годзе ня маюць апалу, пісалася ўжо досыць. Такія весткі маюцца з многіх раёнаў і акруг.

У адказ на гэтае ненармальнае становішча Камісарыят Асьветы дае тлумачэньне, што з яго боку было зроблена ўсё, каб школы мелі належны запас апалу на ўвесь год. Але на справе здарылася іншае. Ня толькі многія школы вясковыя застаюцца без апалу, нават адна з прыгародных школ (гарадзкая мяжа) не працавала нейкі тэрмін з-за адсутнасьці апалу.

Чыя-ж у гэтым віна? Як відаць не Наркамасьветы. З яго боку ўсё ад яго залежачае было зроблена.

Трэба думаць, што тут вінават Лесбел,—высокія цэны як на апал, так і на будаўнічы матар'ял для школ.

Зразумела, што многія райкаштарысы ня вытрымалі і задаволіць школы апалам на ўвесь год не маглі.

Калі мы імкнёмся наставіць асьвету ў больш-менш спрыяючыя ўмовы, то адсутнасьць апалу многа шкодзіць гэтай справе. Таму неабходна падумаць аб апале для школ на наступны год загадзя.

НКА нібы ўжа ўмовіўся з Лесбелам. Але абяцанка-цацанка, а школе невядома, ці будзе радасьць.

За ўрэгуляваньне справы з апалам трэба ўзяцца ня толькі НКА, а і іншым установам.

Пажадана б было пачуць ад РСІ—ці вядома ёй аб гэтым, а калі вядома, то што ёю ў гэтым напрамку робіцца.

Сьпевы ў школе.

Час ужо паставіць на належную вышыню гэтую, калі не забытую, то на крайняй меры закінутую, і як быццам, непатрэбную ў школьным выкладаньні дысцыпліну—сьпевы. Пара ўжо ім даць права грамадзянства ў школьным жыцьці; досыць ужо зьдзекавацца над гэтым мастацтвам ды трымаць яго ў чорным целе. Як ня сумна, але факт застаецца фактам, так яно фактычна і ёсьць. Само сабой разумеецца, што гутарка ідзе не аб гарадзкіх, а аб вясковых школах. Амаль у большасьці вясковых школ сьпевы, як такія, не выкладаюцца. Чаму гэта так? Што за прычына, і што, ці хто зьяўляецца перашкодаю?

Ведаючы прыблізна жыцьцё вясковай школы, мне хочацца адносна закранутага пытаньня сказаць наступнае: першая прычына гэта тая, што настаўнік не даацэньвае тае ролі, якую адыгрываюць сьпевы ў школьных занятках, у здароўі і наогул у жыцьці чалавека; другая—настаўнік ня мае належнае падрыхтоўкі ў гэтай галіне; трэцяя—на справу сьпеваў настаўнік глядзіць, як на нешта лішняе, і, такім чынам, ім няма месца ня толькі ў надзельныя раскладзе лекцый, але і ў гадавым класным журнале.

Акрамя пералічаных прычын, ёсьць яшчэ другія і іх няммала. Трэба сказаць праўду, некаторыя настаўнікі хаця і не ўладаюць музычным голасам, усё ж такі адводзяць нейкую часіну гэтай справе. Але тут само наўстае пытаньне: як такі настаўнік, які сам ня ўмее сьпяваць і кіраваць хорам, праводзіць гэтыя лекцыі? Гэтая справа вырашаецца проста: настаўнік пытаецца ў вучняў, якую яны могуць сьпяваць песьню і, даведаўшыся, прапануе вучням сьпяваць яе. Нават ня чуўшы і ня бачыўшы, можна прыблізна ўявіць малюнак. Тут—«хто ў лес, а хто па дровы», мала сказаць, тут будзе нешта блізкае да зьвярынцу. Значыцца, дрэнна стаіць справа з гэтага боку ў той школе, у якой сьпевы зусім не выкладаюцца і мала лепш у тэй, у якой дзеці сьпяваюць бяз жаднага кіраўніцтва. А раз так стаіць справа, значыцца трэба ад гэтай хваробы шукаць лякарства, а яно не за высокімі гарамі і не за сінімі марамі, а ў кожным горадзе, у якім настаўніцтва папаўняе свае веды, будучы на курсах. Вось на гэтых курсах, побач з другімі дысцыплінамі, трэба ўвесьці, як выкладаньне тэорыі сьпеваў, так і самых сьпеваў і справу наставіць сур'ёзна, а ня так, як гэта было ў мінулым годзе. Было-б вельмі карысна арганізаваць і спэцыяльныя рэгэнцкія курсы.

Кожны год у вёску прыбываюць новыя кадры настаўніцтва з пэдтэхнікумаў і іншых установаў. Здавалася-б, што гэтыя маладыя сілы павінны былі-б справу сьпеваў зрушыць з месца, але на справе ня зусім так. Адгэтуль як пэдтэхнікумам, так і розным настаўніцкім курсам неабходна заняцца гэтым відам мастацтва і не абы як, а як сьлед; сюды трэба залучыць і скрыпку, бо яна вельмі і вельмі дапамагае ў сьпевах. Трэба помніць, што сьпевы ня простая забава, а тэй стымул, які карысна дзейнічае на нашы нэрвы, псыхіку і эстэтыку.

Антон Лёсік

Койданава.

Удзел школы ў падрыхтоўцы да пасяўной кампаніі.

У справе падрыхтоўкі насельніцтва вёскі да пасяўной кампаніі значны ўдзел павінна прыняць наша школа.

Якую працу школа можа правесьці ў гэтым напрамку?

Школа можа паставіць перад сабой задачу вывучыць, як раней сяляне дадай вёскі рыхтаваліся да вясновага пасеву, наколькі насельніцтва было забясьпечана сел.-гаспадарчым інвэнтаром, насеньнем, якой якасьці было гэтае насеньне, якія спосабы ўгнаеньня практыкаваліся, якую дапамогу аказвалі сел.-гаспадарчая кааперацыя і камітэт сялянскай узаемадапамогі, сельсавет; вывучаць пытаньне адносна запатрабаваньняў і перашкод, якія мелі месца ў мінулыя гады; якія былі вынікі ўраджаю ў залежнасьці ад падрыхтоўкі да пасеву розных гаспадарак і г. д.

Маючы фактычны матар'ял аб мінулых гадох, вывучыўшы настрой і імкненьні перадавой часткі насельніцтва, зьвязаўшыся з сельсаветам, камітэтам сялянскай узаемадапамогі і сел.-гаспад. кааперацыяй, школа зможа разьвіць належную агітацыю сярод насельніцтва аб неабходнасьці своечасовай і ўдумлівай падрыхтоўкі да вясновай пасяўнай кампаніі: забясьпечаньне інвэнтаром, штучным угнаеньнем, падрыхтоўваць ачыстку насеньня і г. д.

Мы яшчэ і зараз вельмі часта можам чуць такія адказы ад гаспадароў: «А, калі бог дасьць, дык вырасьце». Школа павінна давесьці да перакананьня, што ня бог, а навука і тэхніка і арганізаваная праца могуць дапамагчы нам дабіцца лепшага жыцьця, павысіць нашы ўраджаі.

Трэба навесьці энэргічную працу і сярод нашых сялянак, якія амаль што выключна займаюцца гародніцтвам і вядуць яго вельмі някультурна.

Пры такой устаноўцы пытаньня можна будзе прыдаць належную жыцьцёвасьць працы, па комплексах 1 і 2 гр. „Падрыхтоўка да вясны і вясновая праца"; у 3 і 4 гр. масавае школы працу можна праводзіць, як сазоннае жыцьцёвае заданьне грамадзкага жыцьця. Больш глыбокую і сур'ёзную працу змогуць правесьці вясковыя сямігодкі і ШСМ.

В. Самцэвіч.

Калектыўны дагавор.

(Нібы фэльетон).

Чуй?

Нічога ня чуй?

Дык, калі ласка, пачну па пунктах.

Пункт першы, прапанова МК

— Гэты дагавор утвараецца ў м-ну Халопенічы паміж Халопеніцкім раймясцкомам працасьветы, які... і Халопеніцкім райвыканком, які...

Што-о! Паміж раймясцкомам і райвыканкомам! Не, на гэта ня згодзен... Унашу папраўку—паміж райвыканкомам і раймясцкомам.

— Гэта-ж чорт ведае што. Райвыканком стаіць на другім месцы пасьля раймясцкому?!

Зразу відаць, што прадстаўнік райвыканкому знаём з жыцьцём баяр часоў Івана Грознага, якія за месца ў час царскай трапезы гатовы былі навесіцца.

Пункт трэці (другі, як і іншыя ў далейшым, апускаецца, бо прынцыповых разыходжаньняў ня маюць) заўваг.

— Гэты дагавор утвараецца на тэрмін з 1-IX 27 г. па 1-IX 28 г.

Папраўка з боку адміністрацыі

— Гэты дагавор утвараецца на тэрмін з дню падпісаньня па 1-IX 28 г.

— Выбачайце, таварыш, ужо люты на носе, як-жа з прайшоўшымі месяцамі? Яны засталіся, нібы бяспрытульнымі.

Неяк няёмка.

— Ну-ну, ня ёмка!

Каму няёмка, а каму можа і вельмі ёмка.

Бачылі такога ёмкага? Зух хлопец.

Пункт дзевяты

— у першую чаргу замяшчаць беспрацоўнымі сябрамі саюзу

Рэдакцыя адміністрацыі—

... у першую чаргу замяшчаць беспрацоўнымі сябрамі саюзу, калі яны па свайму сацыяльнаму стану і ЗДАРОЎЮ будуць да гэтага падыходзіць.

УВАГА: ГЭТА НЯ ТЫЧЫЦЦА ЗВОЛЕНЫХ ПРАЦАЎНІКОЎ АСЬВЕТЫ.

О, гэта і я разумею! Калі ты хворы, ды ў дадатак беспрацоўны, то напэўна табе класьці апошняе здароўе. Шкода. Памірай лепі з голаду.

А вось ўвагі не разумею.—Наколькі мне вядома, звольненых з працы беспрацоўных сяброў саюзу няма: адзін напрасіў звальненьня на год—другі па сямейных абставінах, трэці зволен па скарачэньню штату, у трэцяга «палавіну» перапялі на новае месца, чацьвеэты... Ды ці мала бывае ўсякіх прычын. Досыць таго, што кожны беспрацоўны дзе небудзь працаваў і звольнен. Інакш ён і ў саюзе-б ня лічыўся.

Нічога сабе ўвага. Толькі як ад ле паздаровіцца **«зволеным»**?

Пункт трынаццаты.

— У разьвіцьцё артыкулаў 37, 44, 47, 49, 88 і 90 Кодэксу законаў аб працы, устанаўліваецца наступны парадак звальненьня працаўнікоў.

Адміністрацыя—

—зьнімаецца.

А яшчэ кажуць, што мы гаварыць многа любім.

Дзе-ж яно „многа?—Зьнімаецца і кропка. Ясна і зразумела. Тут ні адзін спартавец больш лёканічна ня скажа.

Ды яно і праўда —у адным пункце аж шэсьць артыкулаў з кодэксу законаў аб працы. Ня ўрокам кажучы, навучыліся абыходзіцца бяз кодэксу, будзем жывы і надалей.

Пункт дваццаць пяты—**працаўнікі, перавдзеныя на другое месца працы супроць згоды, кампэнсуюцца пад'ёмнымі, згодна 82 артык. код. законаў аб працы.**

Адміністрацыя — **прымаецца**, але тут-жа ўвага:

гэты пункт ня тычыцца тых працаўнікоў, якія замяняюцца працаўнікамі са спэцыяльнай асьветай і ў мэтах узмацненьня складу працаўнікоў апорных школ.

Ня ўвага, а золата. Асабліва калі мець на ўвазе, што ні адзін пераведзены настаўнік не замяняецца працаўніком бяз спэцыяльнае (пэдагагічнае) асьветы.

Пункт трыццаць пяты—**раймясцком прымае ўдзел у працы райвыканкому па разьмеркаваньню і скарыстаньню вызначаных па каштарысу сродкаў на патрэбы асьветы.**

Адміністрацыя—**раймясцком прымае ўдзел у працы па складаньню каштарысу на патрэбы асьветы.**

Адным словам, можа пры складаньні каштарысу што-небудзь і дапаможаце, а далей абыйдземся і бяз вас.

Усяго з боку раймясцкому выстаўлена 36 пунктаў, прычым да значнай часткі з іх адміністрацыяй дадад е на— «Калі будзе прадугледжана каштарысам», альбо «калі дазволяць магчымасьці»! Адным словам, калі каштарыс (каб яго пярун спаліў) не прадугледзеў, альбо магчымасьці няма, то настаўнік можа застацца і бяз кампэнсацыі, і бяз дроў і чуць ня без зарплаты.

Адміністрацыя ўсё-ж гэтаю лічбаю пунктаў не задаволілася і дабавіла з свайго боку яшчэ адзін пункцік—37, вось ён:

—раймясцком садзейнічае райвыканкому ў наладжваньні падагагічнай працы ў школах і выкананьні культурна-асьветнымі працаўнікамі сваіх службовых і грамадзкіх абавязкаў.

Інакш кажучы—раймясцком, бяры ў рукі тую прыладу, якою падганяюць, і гані працаўнікоў на службовую і грамадзкую працу.

Да ўсяго вышэйсказанага трэба дадаць, што мясцком пісаў свае праекты на адной палове старонкі, а адміністрацыі свае дадаткі, увагі і новыя пункты на другой палове.

У канцы яны падпісаліся і прыкладзеныя пачаткі, кожны пад сваёй рэдакцыяй.

А хто з іх чые праановы прыняў, так і ня відаць.

Нішто сабе, весёлы народ!

В. Камлюк.

ВУЧНІ РАСПАЎСЮДЖВАЮЦЬ СЯЛЯН. ПАЗЫКУ

(Бобрская школа-сямігодка).

На групавым сходзе 6-й групы вучні вынесьлі пастанову, каб сіламі сваёй групы купіць 10 руб. аблігацыю сялянскае пазыкі.

Зараз-жа пасьля сходу пачалі зьбіраць грошы з кожнага вучня па 25 к., і вось калі вучань прыходзіў дамоў і прасіў у бацькі грошы на аблігацыю, дык ад бацькі сынаўся цэлы шэраг пытаньняў: 1) што за пазыка, якая ад гэтага карысьць дзяржаве, ці можна пасьля грошы вярнуць і г. д.

Такім чынам пачынаюць і бацькі купляць аблігацыі.

Вучань.

Валагодзкі Малочна-Гаспадарчы Інстытут.

(Ад уласнага карэспандэнта).

XV-цігадовы юбілей Інстытуту.

15-га студзеня мінула 15 год існаваньня Валагодзкага Малочна-Гаспадарчага Інстытуту.

Пры ўхіле нашай сельскай гаспадаркі ў БССР у бок малочнага вырабу нельга не адзначыць гісторыі ўзьнікненьня гэтай адзінай вышэйшай малочна-гаспадарчай вучэбнай установы ў нас у СССР, 13 проц. студэнцтва якой ў сучасны момант складаюць беларусы.

За 15 гадоў Валагодзкі Малочна-Гаспадарчы Інстытут вырас у буйную вучэбную установу па малочна-гаспадарчай асьвеце ў СССР і зьяўляецца ня толькі ў нас, але і ва ўсім сьвеце адной з лепшых навукова-дасьледчых установаў па малочнай справе.

15 год таму назад у 14-ці кілёмэтрах ад Волагды на месцы Валагодзкага Малочна-Гаспадарчага Інстытуту знаходзіўся невялікі фальварак нейкіх Буман—датчан родам, якія, здаўна жывучы тут, вялі малочную гаспадарку, а таксама займаліся падрыхтоўкай на практыцы майстроў па вырабу масла і сыру. Справа іх не прайшла без карысьці. Іх майстры - вучні былі піянэрамі нашага вырабу масла і сыру, і з прычыны таго, што ў месцы разьвіцьця гэтай справы патрэбны былі спэцыялісты, дык думка аб спэцыяльнай школе ўзьнікала не адзін раз і ўрэшце ў 1911 годзе 3 чэрвеня быў выданы закон аб закладзе Валагодзкага Малочна-Гаспадарчага Інстытуту, а таксама адпушчаны сродкі на набудову.

Імпэрыялістычная вайна затрымала тэмп набудовы гэтай патрэбнай нам вучэбнай установы, але ў 1916 г. яна ўсё-ж была набудавана, а з 1917 г. былі адчынены 6-цімесячныя курсы інструктароў па малочнай гаспадарцы. Як вышэйшая вучэбная ўстанова ВМГІ разгарнуў сваю дзейнасьць з 1919 г., адначасова адчыніўшы дасьледчыя станцыі. Спачатку іх было: дзьве малочнай гаспадаркі і заатэхнікі, пасьля-ж лік іх узрос да шасьці—біохэмічная, бактэрыялёгічная, машына-дасьледчая, тэхнікі перапрацоўкі малака, заатэхнічная і кормаздабываньня, а таксама поруч з імі вучэбна-вырабляючы масла і сыр завод і вучэбная ферма.

Усе дасьледчыя станцыі аб'яднаны ў два навукова-дасьледчыя інстытуты: 1) па малочнай гаспадарцы і 2) па заатэхніцы і кормаздабываньню. За перыяд сваёй дзейнасьці дасьледчыя станцыі выпусьцілі каля 130 навуковых прац.

З 1913 году ВМГІ зьяўляецца ВУЗ'ам з 2-хгадовым курсам. Адначасова з гэтым пры ім існуюць: ніжэйшая малочная школа, курсы на кадры[illegible] кантроль-асысэнтаў, выкладчыкаў для ніжэйшых сельска-гаспадарчых школ, рабочых пры сельска-гаспадарчых машынах, сялянскі ўядзельны Унівэрсытэт і адчыняюцца завочныя курсы для майстроў па вырабу масла і сыру. Апрача гэтага, Інстытут мае сталую сувязь з цэнтральнымі ўстановамі—Маслацэнтрам, Наркамгандлем, НК Земляробства РСФСР, Масладзяржгандлем, Маславай Інспэкцыяй, камісіяй па стандартызацыі пры Савеце Працы і Абароны і інш., а таксама з месцамі, дзе разьвіта малочная справа, асабліва ў Сібіры.

Інстытут мае 110 чалавек студэнтаў, якія зьехаліся са ўсіх канцоў Савецкага Саюзу, бо Валагодзкі Малочна-Гаспадарчы Інстытут зьяўляецца адзіным у СССР ВУЗ'ам па гэтай галіне. У сваю чаргу скончыўшых ВМГІ можна спаткаць ва ўсіх кутках нашага неабсяжнага Саюзу.

Інстытут мае вялікую бібліятэку, у якой сабрана каля 25000 тамоў спэцыяльнае літаратуры на малочнай справе, як на расійскай, так і чужаземнай мове. Атрымлівае шмат замежнай літаратуры і часопісаў.

Для абслугоўваньня гаспадарчага жыцьця Інстытут мае шэраг установаў і закладаў: электрычную і вадаправодную станцыю, каналізацыйную, электрычную і тэлефонную сеткі.

Знаходзячыся ў раёне з моцна разьвітым ухілам сельскай гаспадаркі ў бок малочнай гаспадаркі, Інстытут мае вялікае значэньне для сялянства. Інстытут праводзіць цэлы шэраг грамадзка-агранамічных мераўпрыемстваў у ваколічных вёсках. Арганізуючы рацыянальнае кармленьне, вядзецца праца па пашырэньню гатунковай жывёлы. З гэтай мэтай праводзяцца конкурсы па гадоўлі бычкоў, адбор цёлак і г. д. У раёне ВМГІ наладжвае штогод выстаўкі па жывёлагадоўлі.

Завод пры Інстытуце перапрацоўвае малако, якое паступае ад 31 вялікіх пунктаў, аб'яднаных у 4 суполкі і 3 малочныя таварыствы. Колькасьць перапрацоўваемага малака расьце з году у год і ў 1927 г. складала 3807556 кілёграмаў.

Завод, прымаючы малако ад сялян, стымулюе разьвіцьцё малочнай гаспадаркі і адначасова выклікае з боку сялянства матар'яльную зацікаўленасьць.

Характарызуючы наогул Інстытут, трэба адзначыць, што, ня гледзячы на гэткі кароткі тэрмін свайго існаваньня, ён зрабіўся высока-культурнай установай і з гонарам займае сваё месца ў шэрагу лепшых ВУЗ'аў СССР.

Зьезд скончыўшых Інстытут і працаўнікоў па малочнай справе

18-га студзеня адчыніўся 1-шы зьезд скончыўшых Валагодзкі Малочна-Гаспадарчы Інстытут.

Усяго зьехалася каля 300 чалавек. Зьезд прыцягнуў да сябе шмат выдатнейшых спэцыялістых малочнай справы, як прафэсары з Масквы—Калантар, Ліскун, Лемус, Герлах, Вайткевіч; з Ленінграду—Матвееў, Дзякаў; з Іванава-Вазьнясенску—Нагорскі; з Яраслаўлю—Дабраправін; ад Валагодзкага Малочна-Гаспадарчага Інстытуту—Івінаў, Каразёў, Болдыраў, а таксама буйныя спэцыялісты Маслацэнтру—Юрмаліт, Дабрасельская,—Наркамгандлю, НК Земляробства РСФСР, Масладзяржгандлю, Маславай Інспэкцыі, Камісіі па стандартызацыі пры Савеце Працы і Абароны СССР, ад партыйных, прэфэсыянальных і іншых арганізацый.

Праф. Ліскун у сваім дакладзе сказаў, што індустрыялізацыя усёй народнай гаспадаркі, якая намячаецца і ажыцьцяўляецца ў СССР, ня можа быць дасягнута, калі раўналежна з ёю не разьвіцьцём насельніцтва ня будзе ў выстарчальнай меры забясьпечана прадуктамі харчаваньня жывёлагадоўлі. Трэба індустрыялізаваць сельскую гаспадарку, павялічыць колькасьць жывых прадукцыйных машын і палепшыць іх якасьць. Асноўнай задачай гэтай індустрыялізацыі зьяўляецца імкненьне рэалізаваць на рынку прадукты працы сялянскага насельніцтва магчыма карысьней.

На шляху заваёвы экспортных рынкаў і агульнага падвышэньня якасьці нашага масла, гаворыць т. Дабрасельская, асноўным пытаньнем зьяўляецца стандартызацыя як прадуктаў, так і самой вытворчасьці.

Стандартнасьць прадукту падвышае яго рыначную цану і адначасова стандартызацыя вытворчасьці зьніжае выдаткі на ёй.

Трэба тыпізаваць самыя заводы і іх абсталяваньне для магчыма поўнай рацыяналізацыі вытворчасьці.

На зьезьдзе было абрана бюро сувязі са скончыўшымі Валагодзкі Малочна-Гаспадарчы Інстытут, якія працуюць у галіне малочнай справы.

ВАЛАТОЎСКІ ЗЬМІТРО.

Па Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Здача страхоўкі.

Ворша, 8-II. За апошні час паступленьне страхавых плацяжоў па акрузе значна павялічалася.

Асабліва павялічылася паступленьне плацяжоў за апошнюю палову студзеня.

За гэту палову паступіла 65.404 р 40 к. альбо 13,2 проц. гадавога заданьня.

На першага лютага паступіла: па лініі сельскага страхаваньня 270441 р. 78 кап. альбо 54 проц. гадавога заданьня, на гарадзкому страхавому абкладаньню 11344 р. 10 к, альбо 71,7 проц. заданьня.

Засталося яшчэ па акрузе з 1-га лютага спагнаць страхавых плацяжоў па сельскаму страхаваньню 223097 р. 48 к. і па гарадзкому страхавому абкладаньню—4436 р. 72 к.

Ёсьць магчымасьць спадзявацца, што ў хуткім часе гарадзкое страхавое абкладаньне будзе выканана, а таксама ўсьлед за ім і вясковае.

Магілёў, 8-2. Да 1 лютага здадзена страхоўкі ў наступным ліку: па Касьцюковіцкаму раёну 68 проц., Чырвонапольскім—63 проц., Чэрыкаўскім—54, Шклоўскім—46, Крычаўскім—71, Чачэвіцкім—66 проц. За другую палову студзеня паступленьні па гэтых раёнах складалі ад 9 проц. (Шклоўскі р.) да 23 проц. (Чачэвіцкі р.).

Перасяленьні ў Крым.

Бабруйск, 8-2. Акруговы зямельны аддзел атрымаў першы нарад на перасяленьне ў Крым 30 сямей яўрэяў-земляробаў. З атрыманых месц, 16 дадзена Глускаму раёну, 14—Парыцкаму. Зараз у гэтых раёнах распачынаецца арганізацыя новых перасяленцкіх таварыстваў па адпраўцы яўрэяў-земляробаў у Крым.

Сельска-гаспадарчы крэдыт.

Ворша. У 1926-27 г. Акрсельбанк атрымаў крэдыту для крэдытаваньня сельскай гаспадаркі акругі ў суме 209704 р. і рэшта нескарыстаных крэдытаў, атрыманых у 1925-26 г. у суме 28950 р. Гэтыя крэдыты былі разьмеркаваны па паасобных раёнах акругі своечасова і па простаму прызначэньню. Але адначасова з гэтым заўважаўся некаторы перабойны і не заўсёды своечасовы перавод сродкаў з боку Бел-сельбанку, у выніку чаго частка мэліярацыйных крэдытаў у мінулым годзе не магла быць своечасова скарыстана ў акрузе.

За правільным разьмеркаваньнем атрыманых крэдытаў крэдытнымі таварыствамі паміж сельскімі гаспадаркамі і калектывамі быў устаноўлены нагляд з боку Акрсельбанку, а за мэтавым скарыстаньнем крэдытаў, выданых на мэліярацыю мэліярацыйным таварыствам, быў устаноўлены нагляд з боку акругзагасьвета зямельнага аддзелу праз гідратэхніка, які за працягу году зрабілі агляд 40 мэліярацыйных таварыстваў.

З абсьледваньня сельска-гаспадарчых крэдытных таварыстваў заўважана, што крэдыты, якія атрымліваюцца ад Акрсельбанку, разьмяркоўваліся некаторымі крэдытнымі таварыствамі паміж сялянамі несвоечасова, што праверка скарыстаньня пазык праводзіцца несыстэматычна і нецэнтралізавана, некаторыя сельска-гаспадарчыя крэдытныя таварыствы скарачалі вызначаныя тэрміны пагашэньня пазык, ёсьць таксама лішкі нескарыстаных крэдытаў. Пры праверцы скарыстаньня крэдытаў на мэліярацыю заўважана, што некаторыя мэліярацыйныя таварыствы ня выканалі тых работ, на якія атрымалі крэдыты, скарыстаўшы іх на іншыя гаспадарчыя патрэбы.

У далейшым акрвыканкам прызнаў патрэбным узмацніць нагляд за скарыстаньнем і падлікам крэдытаў, якія выдаюцца за лік надзвычайнага бюджэту, пры выдачы пазык асабліва з фонду беднаты, неабходна рабіць папярэдні агляд тых гаспадарак, якія патрабуюць пазыку, Акрсельбанку і Акрсельсаюзу вывучыць пытаньне аб магчымасьці крэдытаваньня на суму больш 1000 р. праз крэдытныя таварыствы калектываў, мэліярацыйных таварыстваў і іншых сельска-гаспадарчых аб'яднаньняў, а таксама зьменшыць драбленьне крэдытаў з мэтаю больш поўнага задавальненьня пазыкаю сапраўдных патрэбы пазычкоўцаў і г. д.

М.

ДА РАСПРАЦОЎКІ ВАПНЫ.

Бабруйск, 3-II. У хуткім часе спэцыялісты пры зямельным аддзеле распачнуць досьлед залежаў вапны на вучастку, які знаходзіцца ў межах вёскі Кісялевічы.

На гэтым вапнавым вучастку распрацоўку вапны мяркуе распачаць калёнія зьняволеных «Чырвоны Сьцяг».

ДАПАМОГА ПАЛІТЗЬНЯВОЛЕНЫМ.

Гомель, 8-II. Двухтыднёвік дапамогі палітзьняволеным Польшчы, арганізаваны Акружкомам МОПР'у, праходзіць з посьпехам. Ужо сабрана ў карысьць палітзьняволеных больш 2.000 руб.

З асаблівым посьпехам праходзіць збор сродкаў у Залінейным раёне; апрача розных адлічэньняў ячэйкі МОПР'у сабралі тут 1000 руб.

БУДУЕМ НОВУЮ ДЗІЦЯЧУЮ КАМУНУ.

Бабруйск, 8-2. Асыгнавана 30.000 р. на абсталяваньне вялікага будынку ў былым панскім маёнтку ў Жылічах (Бабр. р.), дзе будзе ўтворана дзіцячая камуна з дзяцей дзіцячых дамоў. Пры камуне будуць арганізаваны розныя майстэрні, таксама дзеці будуць працаваць па сельскай гаспадарцы пры камуне.

162.000 РУБ. НА ПАБУДОВУ НОВЫХ ШКОЛ.

Бабруйск, 8-2. Сёлета па акрузе намечана пабудаваць па дзяржаўныя сродкі 23 школы. На пабудову гэтых школ па мясцоваму бюджэту асыгнавана 78.000 руб. і субвэнцыі па 84.000 руб. Усяго на пабудову школ у гэтым годзе будзе затрачана 162.000 рублёў.

Перад 10-ай гадавінай Чырвонай арміі.

Т. т. рабкоры і селькоры пішуць, што зроблена на мясцох у справе практычнай дапамогі сем'ям чырвонаармейцаў, інвалідам і партызанам грамадзянскай вайны і дэмабілізаваным чырвонаармейцам.

ТДА-Авіяхім на Чэрвеншчыне.

На Чэрвенскаму раёну налічваецца 25 ячэек ТДА-Авіяхіму, з іх 11 у самым горадзе пры мясцовых камітэтах прафсаюзаў, 10 пры сельсаветах, рэшта ў савецкіх гаспадарках і на фабрыцы «Праца».

Т-ва налічвае 900 сяброў, у гэтым ліку членаў і кандыдатаў КПБ 83 ч., камсамольцаў 110 чал.

Запазычанасьць у акруговы савет ТДА-Авіяхіму раўняецца 782 р. 74 к.

Грашовая частка ў т-ве вядзецца дрэнна. Зрабіць падлік, колькі вінаваты ячэйкі за значкі, білеты і маркі нельга, бо самая грашовая кніжка заведзена з 25 жніўня мін. году, калі было ўтворана новае часовае бюро райсавету, але грашовая кніжка вядзецца і да гэтага часу кепска.

Вайсковых гурткоў у раёне 5, але працуюць толькі два—у вёсках Вялікапольлі і Пляцівішчы. Кіруе гурткамі і наогул вядзе ўсю працу маладзы настаўнік-пераменьнік.

Адной з галоўных перашкод у працы т-ва зьяўляецца тое, што ў райсавет абраны адказныя асобы на сваёй непасрэднай службе і перагружаныя працай. Але ўсё-ж такі ў параўнаньні з мінулым праца т-ва рушылася з месца.

Сябра т-ва.

Як выконваецца закон аб ільготах сем'ям чырвонаармейцаў.

(Менская акр.).

Пытаньне аб ільготах сем'ям чырвонаармейцаў ва ўмовах савецкай дзяржавы набывае асабліва важнае значэньне. Камплектаваньне Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі адрывае найбольш здаровую і працаздольную частку насельніцтва ад працы на гаспадарцы.

Вось чаму савецкая ўлада з самага пачатку арганізацыі Чырвонай арміі стала аказваць дзяржаўную і грамадзкую дапамогу тым сем'ям, члены якіх са стрэльбай у руках абаранялі савецкую краіну.

Да 1924 году ўсе законы аб ільготах вайскова-служачым і іх сем'ям ня былі сыстэматызаваны. Выданы ў 1924 г. **кодэкс законаў аб ільготах вайскова-служачым** аб'яднаў і згрупаваў усе законы, якія былі апублікаваны за 6 гадоў у „Зборы законаў і загадаў Рабоча-Сялянскага ураду".

Кодэкс значна палегчыў працу цэнтральных органаў улады і працаўнікоў на мясцох.

Савет Народных Камісараў БССР сваёй пастановай ад 28 красавіка зацьвердзіў інструкцыю для ўжываньня кодэксу законаў аб ільготах вайскова-служачым Чырвонай арміі і флёту.

Да 10-ай гадавіны Чырвонай арміі мы павінны падагуліць, што зроблена ў справе практычнай дапамогі сем'ям чырвонаармейцаў на кожнай акрузе і раёну.

Па Менскай акрузе да пачатку 1927 году сталага вучоту сем'яў вайскова-служачых ня было. Вучот быў праведзен пасьля пастановы АВК ад 1-III—1927 г., у зьвязку са справаздачай аб ільготах.

Усяго па Менскай акрузе па праведзенаму вучоту налічвалася 1331 сям'я служачых у Чырвонай арміі і флёце.

Выпрацаванага пляну прадстаўленьня ільгот сем'ям чырвонаармейцаў ня было. Ільготы даваліся ў працэсе правядзеньня таго ці іншага мерапрыемства (с-г. падатак, землянупарадкаваньне, разьмеркаваньне лесу і інш.).

За 1925-26 год сем'ям чырвонаармейцаў па Менскай акрузе прадстаўлены ільготы:

ЗВОЛЬНЕНА АД ПАДАТКУ

на 100 проц. 20 гаспадарак на суму 243 руб. 31 кап., на 75 проц.—648 гасп. на суму 5415 руб. 11 кап., на 50 проц.—81 гаспадарка на суму 773 р. 04 кап., на 25 проц.—462 гаспадаркі на суму 5179 руб. 26 кап.

Усяго — 1211 гаспад. на суму 11.610 руб. 72 кап.

Ад уплаты страхоўкі звольнена 179 сем'яў на суму 528 р. 44 к.

Звольнена ад уплаты за землянупарадкаваньне: часткова 8 сем'яў на суму 48 руб., поўнасьцю 27 сем. на суму 243 руб.

Пры разьмеркаваньні лесаматар'ялу сем'і чырвонаармейцаў атрымоўвалі яго на ільготных умовах. Так, 36 сем'ям лесаматар'ял адпушчан дармова на суму 364 руб., 73 сем.—у крэдыт на суму 3.222 руб. і 34 сем. адпушчана ў крэдыт дроў на суму 351 руб.

Грашовая дапамога аказана 89 сем'ям у суме 1396 руб.

Пазычана насеньня розных культур 118 гаспадаркам. Некаторыя сем'і часова карысталіся на ільготных умовах сельска-гаспадарчым інвэнтаром і г. д.

У ГАЛІНЕ НАРОДНАЙ АСЬВЕТЫ

на гораду Менску: 96 дзяцей вайскова-служачых звольнена ад платы за навучаньне ў школах, 12 дзяцей зьмешчана ў дзіцячыя дамы, 41 вайскова-служачы навучаліся ў вайсковых школах. Па раёнах: усе дзесяць сямей чырвонаармейцаў, якія навучаліся ў 7-мігадовых школах, былі звольнены ад платы.

У галіне аховы здароўя: дармова аказана амбуляторная мэддапамога 3.461 асобе і 1.256 асобам стацыянарная.

Што датычыцца ільгот па судовых, канцылярскіх зборах і інш., дык гэтыя даваліся ў выпадку звароту

ПЭНСІІ СЕМ'ЯМ ЧЫР-ЦАЎ.

Апрача памянёных ільгот сем'і чырвонаармейцаў атрымлівалі пэнсію ад 3 руб. 75 кап. да 7 руб. 50 кап. Па гораду—45 сямей, па раёнах 17 сямей.

Усе гэтыя лічбы яскрава сьведчаць аб тым, што савецкія органы на мясцох у сваёй штодзённай працы на справе ажыцьцяўляюць кодэкс законаў аб ільготах вайскова-служачым і іх сем'ям.

Бязумоўна, і ў гэтай справе ёсьць шмат недахопаў, якія неабходна зьнішчыць. Адным з галоўных недахопаў зьяўляецца адсутнасьць сталага вучоту. Ільготы і дапамога даюцца амаль кожнай чырвонаармейскай сям'і, а вучоту гэтай працы ў некаторых установах аніякага няма. Наладзіць вучот—наша першачарговая задача.

ПА ЎСЯМУ СССР ІДЗЕ ПАСЬПЕШНАЯ ПАДРЫХТОЎКА ДА 10-ГОДЗЬДЗЯ.

Чырвонаармейскі унівэрсытэт.

Маскоўскім губ. аддзелам асьветы зараз распрацоўваецца праэкт арганізацыі да 10-цігодзьдзя Чырвонай арміі **чырвонаармейскага унівэрсытэту** на тыпу ўжо існуючых рабочых унівэрсытэтаў.

Працаўнікі мастацтва—Чырвонай арміі.

Усе тэатры Кіева рыхтуюць спэцыяльныя пастаноўкі для чырвонаармейскіх часьцей. Апрача гэтага, ва ўсіх часьцях гарнізону на працягу 2 тыдняў адбудуцца канцэрты з удзелам артыстаў усіх тэатраў гораду.

Курорты для хворых чырвонаармейцаў.

Адэскі «Чырвоны Крыж» выдзеліў на прыморскім курорце імя Андрэя Іванова пастаянныя месца імя Варашылава для хворых чырвонаармейцаў.

Царкву—пад Дом Абароны.

У гор. Почыпе, Бранскай губ., група вернуючых адмовілася ад карыстаньня Уладзімірскай царквою. У зьвязку з гэтым пленум павятовага выканкому зацьвердзіў пастанову гарсавету аб перадачы будынку царквы пад **Дом Абароны**, які мае быць адчынены да 10-ай гадавіны Чырвонай арміі.

10 міліёнаў на абарону краіны.

У праведзеньні кампаніі «Наш адказ Чэмберлену» актыўны ўдзел прынялі працоўныя масы, аб'яднаныя ў прафсаюзы ТДА-Авіяхіму, кааперацыя і інш. У выніку зборы ў фонд узмацненьня тэхнічнай базы абароны на 1-га лютага дасягнулі 8.073.717 руб. 74 кап. З гэтай сумы прафсаюзамі сабрана і пераведзена ў цэнтр 4.205.765 руб. 44 кап., па лініі кааперацыі—361496 руб. 50 кап. і ТДА-Авіяхіму—3.506.457 руб. 65 кап.

АБВЯШЧАЕЦЦА КОНКУРС

на лепшы допіс аб ходзе кампаніі па рэалізацыі пазыкі ўзмацненьня сельскай гаспадаркі.

У конкурсе могуць прымаць удзел усе селькоры і сяляне Савецкай Беларусі.

Конкурс праводзіцца на старонках газэты **«Беларуская Вёска»** з 1-га лютага па 1-га мая 1928 г.

За лепшыя допісы будуць выдадзены прэміі (агулам на пяцьсот рублёў).

1-ая прэмія—радыё-прыёмнік.
2-ая прэмія—творы Леніна.
3. Тры прэміі—бароны пружыновыя.
4. Тры прэміі—3 адрэзы сукна на гарнітуры.
5. Тры прэміі—3 пары ботаў.
6. Пяць прэміі па 20 рублёў.
7. Дзесяць прэмій па 10 рублёў.
8. Тры прэміі—3 плугі.

Конкурсная Камісія выдзелена з наступных таварышоў:

Старшыня—Шукевіч-Трацьцякоў і сябры—т.т. Масальскі, Абрамсон, Тарбуз, Платун, Вайцеховіч, Давідовіч, Аксючыц і Адынцоў.

Старшыня Конкурснай Камісіі **ШУКЕВІЧ-ТРАЦЬЦЯКОЎ**.

Рабочае жыцьцё.

Без калектыўнага дагавору.

У вёсцы Малашках, Старасельскага сельсавету, Заслаўскага раёну, малочная арцель «Серп» некалькі гадоў эксплёатуе працу рабочага—сябра саюзу работнікаў зямлі і лесу гр-на Харужыка без заключэньня на яго з райсаюзам колдагавору. Ён працуе з раніцы да вечара, ня маючы рэгляментаванага рабочага дню. На яго аднаго ўскладзена досыць цяжкая праца —выраб масла, сыраў і сьмятаны. Аднойчы райсаюз прапанаваў арцелі у парадку законаналажэньня, заключыць колдагавор на рабочага, але арцель рашуча адмовілася. Райсаюз зноў аб гэтым змоўк, і арцель мацней узяла лейцы у свае рукі.

Райсаюз, пара табе ачнуцца і прымусіць малочную арцель заключыць колдагавор.

Малашкаўскі.

Забытыя галіны працы.

Усе нашыя грамадзкія арганізацыі пачынаюць працаваць толькі тады, як пачынаюцца кампаніі, ці ў газэтах загавораць аб гэтым. Напрыклад, ваенізацыя так добра была разгорнута, цяпер аслабла. Яшчэ больш яскравыя прыклады—гэта шэфскія т-вы і МОПР. Гэтыя арганізацыі амаль спынілі сваю дзейнасьць. Сходаў гэтых арганізацый ня было. Членскія ўзносы па году і больш ня плацяцца. Часопісі па МОПР'у не распаўсюджваюцца, а часопісаў шэфскага т-ва і ня знойдзеш на заводзе. Выезды ў вёску, каб даць настаноўку, правесьці сход, кампанію, даклад, ня робяцца, не гаворачы ўжо аб тым, што эканамічна не дапамагаюць вёсцы.

Яшчэ горшая хвароба з беларусізацыяй. У мінулым годзе, як узьнялі крык, дык пачалі газэты выпісваць, часопісі, кніжкі чытаць, гурткі арганізоўваць па вывучэньню белмовы і г. д. Але гэта хутка закінулі. Часам па дзьвярах канторы (напр., Лесбел) маюцца надпісы: «Гаманіце па беларускай мове», а самі чыноўнікі і ня дбаюць аб беларусізацыі.

У цэнтральным клюбе г. Нова-Барысава беларускай газэты, часопісі (апроч „Зьвязды" і двух дзесяткаў беларускіх кніжак у бібліатэцы) і з агнём ня знойдзеце. Ня толькі па заводзе «Камінтэрн», але і ўсе фабзавкомы г. Н.-Барысава забыліся аб гэтай галіне працы.

А.

Барысаў.

Дарма грошы трацяцца.

Ёсьць на заводзе «Камінтэрн» у г. Нова-Барысаве і культпрацаўнік, які атрымлівае каля 100 руб., а другі інструктар фізкультуры 45 руб. у месяц, аднак працы ня відаць. Інструктар раз, ці два ў месяц прыдзе на заліткі, якія ня могуць здаволіць моладзь і нічога не дае. Культпрацаўнік толькі кіруе драмгуртком, а ў бібліатэцы яго ня знойдзеш. Па паўтары-два месяцы кніг не мяняюць. Вечары праходзяць кепска, у памяшканьне набіраецца людзей больш як трэба. Паветра цяжкае, так накураць, што цёмна ад дыму робіцца, душна—нельга вытрымаць. Пастаноўкі па два разы паказваюць, а пасьля да 3-х гадзін ночы скокі. Сухія даклады прыеліся рабочым, а такія цікавыя тэмы, як сям'я, праблема пола, літаратура, навука і тэхніка, сьвятавая або вусная газэта, гумарыстычныя апавяданьні,—ня ставяцца. Найгалоўнейшае гэта тое, што няма зацікаўленасьці і дрэннае кіраўніцтва працаўнікоў, якія дарма грошы атрымліваюць.

А. Каган.

Н.-Барысаў.

Ажыла клюбная праца.

Клюб—гэта адзін з самых лепшых прытулкаў у г. Воршы, дзе рабочы можа правесьці вольную хвіліну і спакойна адпачыць.

У сучасны момант пасьля абсталяваньня, якое каштавала 2000 р., клюб выглядае, як запраўдная месца адпачынку.

Пры клюбе арганізавана шмат гурткоў: драматычны беларускі і яўрэйскі, рабкораўскі, шахматна-шашачны, харавы, музычны, літаратурны, радыё-гурток, мастацкі і вайсковы.

Вайсковы гурток досыць добра разгарнуў сваю працу. Пабудован цір. Закуплена шмат малакаліберных вінтовак, патронаў, прыбораў для стральбы шрацінай і г. д.

Утвараюцца часта спаборніцтвы паміж саюзамі.

Апрача гэтага, арганізаваны розныя гульні.

Пры клюбе адчынен буфэт ЦРК.

У сучасны момант клюб налічвае больш 400 сяброў.

Пры клюбе адчынен АПА габінэт, які ставіць сваёй мэтай дапамагчы ўсім таварышам, якія наведваюць палітшколы, розныя гурткі, па самаадукацыі індывідуальна займаюцца над павышэньнем свае асьветы шляхам падбору адпаведных падручнікаў, матар'ялаў, дапаможнікаў і г. д.

У АПА габінэце ўстаноўлены гадзіны праграмнага правядзеньня заняткаў па ўсіх існуючых галінах выкладаньня.

Пры клюбе існуе бібліатэка, у якой маецца шмат каштоўнай літаратуры.

Адчынена чытальня, якую штодзённа наведвае больш 100 чалавек.

Дзякуючы ўзмоцненай працы клюб ажыў, заварушыліся у ім людзі. Кожны вечар прыходзяць сотні рабочых, якія з карысьцю праводзяць час адпачынку.

У сучасны момант кожны рабочы цікавіцца клюбнай працай, дапамагае ёй, прымае актыўны ўдзел у ёй.

Вось што значыць паладзіць працу, прыцягнуць шматлікія калёны рабочых да грамадзкай працы.

Аршанскі рабоча-партыйны клюб з кожным днём усё больш і больш заваёўвае аўтарытэт в боку рабочай масы.

С.

Ворша.

На гуце „Пралетары".

Побач стаяць яны вялікія і маленькія, адваліраваныя і шматсьценныя і на кожнай з іх доўгі рацэпт з дакладным апісаньнем лякарства, прапісанага доктарам вам, вашай хворай жонцы, ці вашаму малому хвораму дзіцяці. Такія сотні і тысячы бутэляк мы бачым ва ўсіх аптэках гораду, але мала з нас хто ведае, як вырабляюцца гэтыя бутэлькі, ці цяжкая гэта праца для тых, хто заняты на гэтай вытворчасьці і як жывуць і колькі зарабляюць працоўныя рабочыя гуты. Калі не, то пойдзем разам і наглядзім хоць на хвіліну на менскую гуту, што там робіцца.

* * *

Рабочы квартал, дзе знаходзіцца які небудзь завод, ці фабрыка, ва ўсіх гарадох і ва ўсіх краінах сьвету мае свой, якісь-та запрыкметы, часта вельмі цяжкі для апісаньня, свой уласны адбітак, які адрозьнівае яго ад іншых цэнтральных кварталаў гораду.

Рыгораўская вуліца мае таксама штосьці сваё ўласьцівае, рабочае. А вось і менская гута «Пралетары». Калі вы думалі ўбачыць перад сабой вялізную махіну з шматлікімі комінамі, вывускаючымі ў неба цэлыя слупы дыму, то вы мылiцеся. Гута „Пралетары" з вадворнага выгляду вельмі маленькі будынак—нават дзівішся, як гэта ў такім маленькім будынку могуць быць заняты на працы 320 чалавек. Але пройдзем праз двор, увойдзем у будынак заводу, дзе вырабляюцца цікавячыя нас бутэлькі. Пасярэдзіне—вялізная распаленая да чырвонага печ з шматлікімі дзьверцамі з шырокаю пляцформаю ва вакол яе. Вам прыходзілася мусіць калі небудзь бачыць малюнкі „пекла", дзе „грэшнікі павінны будуць гатавацца да сканчэньня вякоў". Дык вось такое ўражаньне робіць на вас гэтая печ з распаленай да агню масай у сярэдзіне. Нават сьлёзы на вачох паказваюцца, калі з непрывычкі паглядзіш у яе адчыненыя дзьверцы. Толькі гэтая распаленая маса знаходзіцца тут не для пакут „грэшнікаў". Задача яе другая—яна служыць для вырабу бутэляк і бутэлечак, якімі мы так часта карыстаемся.

Як мыльныя пузыры з саломкі выдуваюцца рабочымі гуты розныя формы бутэлькі. Толькі тут замест саломкі доўгія трубкі з больш цьвёрдага матар'ялу і замест мыла,—распаленая да чырвонага маса. Потым яны аддзяляюцца ад трубкі, кладуцца ў чан з халоднаю вадою, і бутэлькі гатовы. Застаецца толькі аддзяліць брак ад добрых і паслаць іх па назначэньню.

— Выраб бутэляк ня вельмі шкодна адбіваецца на здароўі рабочых?—пытаюся я ў аднаго з старых і вопытных рабочых,—бо прыходзіцца дуць на распаленую да агню масу.

— Зразумела, адбіваецца і нават вельмі моцна, адказвае ён мне і, памаўчаўшы, дадае:—нічога ня зробіш:—такая ўжо наша спэцыяльнасьць.

— Ну, а як зарабляеце?

— Да як вам сказаць:—жанчыны зарабляюць 40-45 р. у месяц, памоцнікі майстроў 60-70 р., а вопытныя майстры зарабляюць і больш сотні. У сярэднім руб. 75-85. Наогул кажучы, жыць можна.

— А вытворчасьць? Ці шмат вырабляеце вось такіх бутэляк.

— Да тысяч трыццаць штук у дзень вырабляем,—адказваюць мне,—вось усё гавораць аб пастаноўцы другой печы—тады зразумела і выраб павялічыцца.

Н. Б. П.

ПРАДАЕЦЦА

зрыў-папера, макулатура і старыя газэты.

Спытацца ў канторы газэты „Савецкая Беларусь"

(Рог вуліц Карла Маркса і Ленінскай, 2-гі дом Саветаў).

Барацьба з валакітай у судова-працоўных справах.

(З нарады пры Народным Камісарыяце Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі БССР).

Прапановы НК РСІ СССР.

7-га лютага пры НК РСІ Беларусі адбылася нарада прадстаўнікоў НК РСІ, НК Працы, ЦСПСБ і інш., якая абгаварвала пытаньні зьнішчэньня валакіты, бюракратызму і суцяжніцтва ў судова-працоўных справах.

Народны Камісар РСІ тав. Калінін зачытаў прапановы НК РСІ СССР адносна зьнішчэньня валакіты ў памянёных справах.

— Галоўнае зло ў вырашэньні спраў працы ў канфліктных і судовых органах у тым, што справы цягаюцца па судох некалькі год. Рабочы ці служачы ходзіць некалькі месяцаў з пастановаю канфліктнага ці судовага органу і ніякім чынам не даб'ецца яго выкананьня.

Адміністратары ня лічацца з пастановамі канфліктных органаў і робяць так, як самі хочуць.

Тэрміны выкананьня і праходжаньня спраў праз канфліктныя і судовыя органы, якія запрапанаваны НК РСІ СССР, наступныя:

Тэрмін подачы скаргі ў РКК аб звальненьні—3—7 дзён, на іншых справах—2 тыдні; тэрмін вырашэньня спраў у РКК—3 дні ад дню подачы заявы; апратэставаньне пастановы РКК у органы працы—7=14 дзён; у органах працы—ня больш 7 дзён; апратэставаньне ў суд—праз 7 дзён і г. д.

Прапановы РСІ СССР поўнасьцю ня вычэрпваюць тых недахватаў, якія бываюць у практычнай працы.

З гэтай прычыны, усе зьмены, якія прапануюцца, павінны быць абгавораны на шырокіх сходах з удзелам усіх зацікаўленых устаноў, арганізацый і асоб.

Голас працаўнікоў з месц.

За невыкананьне—да матар'яльнай і крымінальнай адказнасьці.

У спрэчках прыняў удзел пракурор па справах працы тав. Глезэраў.

— Кожная справа,—кажа тав. Глезэраў,—так пладавіта напшікована рознымі спраўкамі, што ня толькі прафработнікам, але часта і нам, судовым спэцыялістам, трудна ў іх разабрацца.

Калі мы ўстановім цьвёрдыя і, зразумела, меншыя тэрміны праходжаньня спраў у працоўных сэсіях, то будзе шмат менш валакіты.

Асноўная маса канфліктных спраў павінна праходзіць абавязкова праз РКК, а не непасрэдна праз працсэсію.

Неабходна, каб адміністрацыя лічыла аўтарытэтнымі пастановы РКК.

НК Юстыцыі прапануе:

1) Устанавіць матар'яльную і крымінальную адказнасьць за невыкананьне пастаноў суду і канфліктных органаў.

Калі той ці іншы адміністратар заплаціць са свае кішэні, дык будзе выконваць пастановы.

2) Касацыйныя скаргі павінны перадавацца ў вышэйшыя канфліктныя і судовыя органы тады, калі будзе спраўка аб выкананьні пастановы ніжэйшага органу.

3) Устанавіць цьвёрдыя і па магчымасьці кароткія тэрміны праходжаньня спраў праз працоўную сэсію.

4) Зьнішчыць раўналегласьць у працы канфліктных і судовых органаў. (Бывае так, што адна і тая самая справа вырашаецца і ў канфліктнай установе і ў працоўнай сэсіі).

5) Пастановы інспэктара працы павінны раўнацца з пастановамі акрсуду па непрацоўных справах і выконвацца ў працягу 24 гадзін.

Нездаровая цеаніна і бюракратызм.

Ад прафсаюзу працасьветы выступіў тав. Мельнік, які зазначыў:

— Мне давадзілася бачыць справу, якая прайшла 28 інстанцый. Гэта яскрава гаворыць за тое, што ў справе вырашэньня канфліктаў працы ёсьць нездаровыя цяганіна і бюракратызм.

Часта бывае, што на суд ня прыходзяць бакі, і справа спыняецца. Пасьля гэту справу зноў заводзяць і гэтак без канца. Такім чынам, адрываюцца ад працы судовыя органы, прафэсыянальныя і іншыя працаўнікі і ніхто за гэта не адказвае. Трэба ў такіх выпадках ўскласьці адказнасьць на вінаватых.

Суцяжніцтва і валакіта зайшлі вельмі далёка.

Народны Камісар Працы т. Бэнэк у асноўным згаджаецца з прапановамі НК Юстыцыі.

— Галаваццяжкія рашэньні нашых адміністратараў,—кажа тав. Бэнэк,—губяць дзесяткі тысяч рублёў. Пастановы канфліктных органаў адміністратары ня выконваюць і толькі цягаюцца па судох, трацячы вялікія сродкі. Некаторыя работнікі хадзілі з пастановамі канфліктных органаў па некалькі месяцаў і нічога не маглі дабіцца. Савецкая ўлада ў іх вачох была зьведзена на нішто, і за такія выбрыкі ніхто ня нёс адказнасьці.

Суцяжніцтва і валакіта ў справах працы зайшлі вельмі далёка; нам неабходна дамагчыся і мы даб'ёмся таго, што пастановы будуць выконвацца.

Ёсьць прычыны і ў тым, што нашы законы дапушчаюць вельмі вялікія тэрміны ад часу, калі вынікне канфлікт, да часу яго абскарджаньня. Калі гэтыя тэрміны скарацiць, дык адразу ў нас будзе на 75 проц. менш канфліктных спраў.

Тут адзін з таварышоў казаў, што трэба ліквідаваць прымірыцельныя камэры. Ён, мабыць, не знаёмы з іх працаю. Прымірыцельныя камэры вырашаюць 49 проц. усіх спраў, і гэта лічба кажа аб карыснасьці іх існаваньня.

* * *

Нарада ў асноўным згадзілася з прапановамі РСІ СССР і для датальнай распрацоўкі іх выбрала камісію з 12. ч.

Хроніка.

У Менскім акрвыканкоме.

За якасьць мэдыцынскага абслугоўваньня.

Каб лепей абслужыць насяленьне мэдыцынскаю дапамогаю з якаснага боку, прэзыдыум АВК пастанавіў правесьці аб'яднаньне больнічных аптэк з аптэкамі, якія знаходзяцца на гаспадарчым разрахунку ў раёнах: Лагойскім, Койданаўскім, Халопеніцкім, Плешчаніцкім, Грэскім і Астрашыцка-Гарадзецкім. Аб'яднаньнем будзе дасягнута магчымасьць накіруць на працы добра кваліфікаваны фармацэўтычны пэрсанал.

Адміністрацыйныя часткі пры РВК.

Прэзыдыум АВК пастанавіў хадайнічаць перад СНК БССР аб арганізацыі пры райвыканкомах адміністрацыйных частак. На абавязку гэтых частак будзе ляжаць: разгляд пратаколаў за парушэньні абавязковых пастаноў, за лесапарушэньні, выдача дазволаў на гандаль сьпіртусовымі напіткамі, арганізацыя прымусовых работ і інш.

3.000 руб. на падрыхтоўку да сьвята Чырвонай арміі.

Адпушчана 3.000 рублёў на падрыхтоўку да сьвяткаваньня 10-годзьдзя Чырвонай арміі.

Аднаўленьне згарэўшага млына.

АВК і Узьдзенскі РВК прынялі меры да аднаўленьня нядаўна згарэўшага Узьдзенскага млына. Атрымана страхоўка—4.300 р. і асыгнаваньне з мясцовых сродкаў. У Менску закуплены млынавыя прылады і абсталяваньне. Праз месяц млын будзе пушчан у ход.

Гаспадарчае ўпарадкаваньне мястэчак.

АВК камандыраваў у м. Капыль камісію з прадстаўнікоў акрпляну, акрза і саматужна-прамысловай кааперацыі для вывучэньня гэтага мястэчка на месцы і падрыхтоўкі яго да гаспадарчага ўпарадкаваньня. У некаторых мястэчках гэта праца ўжо зроблена.

Маленізацыя.

Акруговы зямельны аддзел праводзіць пагалоўную праверку (маленізацыю) коняй у акрузе дзеля выяўленьня сапных захвораньняў. Сельсаветы вызначылі адпаведныя тэрміны і пункты, дзе будзе рабіцца праверка. Гэта праца пачнецца з 1 сакавіка і працягнецца 2 месяцы. На правядзеньне маленізацыі НК Земляробства адпусьціў 18.000 рублёў.

250 руб. на карысьць кітайскага камсамолу.

Нядаўна Менская камсамолія наладзіла вечар на карысьць кітайскага камсамолу. Вечар даў 250 руб. Гэткія вечары будуць наладжаны ўва ўсіх рабочых клюбах гор. Менску.

Ушанаваньне старых працаўнікоў Осо-Авіяхіму.

Цэнтральны савет Осо-Авіяхіму БССР запрапанаваў усім акруговым саветам выдзеліць старых актыўных працаўнікоў Осо-Авіяхіму для ўшанаваньня іх у часе сьвяткаваньня 10 гадавіны Чырвонай арміі.

Пашырэньне дзейнасьці калектыву «Беларускі Ларок».

Дзейнасьць працкалектыву «Беларускі Ларок» з кожным годам усё больш пашыраецца. Зараз у Менску ларок налічвае 36 крам. Звароты калектыву таксама значна павялічыліся. Так, за 1925-26 апэрацыйны год зварот раўняўся 1300000 р., а за 1926-27 г. ён павялічыўся да 2047000 р.

Збыт прадукцыі беларускага заводу «Пралетары».

Маскоўская кантора Белвайгандлю надпісала дагавор з „Мосторгом" на пастаўку апошняму 12 вагонаў кафель вытворчасьці заводу „Пралетары".

Кафлі павінны быць здадзены да верасьня г. г.

17 вагонаў баваўняна-папяровых тавараў для БССР.

Нар. Кам. Гандлю СССР зрабіў разьмеркаваньне баваўняна-папяровых тавараў.

Для БССР на першую 10-підзёўку бягучага м-ца выдзелена 17 вагонаў гэтых тавараў.

1086 чал. паслана на работу ў студзені.

31 студзеня да 1 лютага Менская Біржа Працы паслала на работу 1086 беспрацоўных, з якіх на часовую работу паслана 990 чал.

Тав. Ягораў у Менску.

Учора ў Менск прыехаў камандуючы войскам Беларускае Вайсковае Акругі тав. Ягораў.

Тав. Ягораў адведаў ваенную ігру Менскага гарнізону.

Намесьнік СНК Грузіі ў Менску.

На гэтых днях пабываў у Менску намесьнік старшыні СНК Грузіі т. Джугалі. Тав. Джугалі наведаў Музэй Рэвалюцыі, Беларускі Дзяржаўны Музэй і ІБК.

Цікавяцца бел. культурай.

Надчас знаходжаньня ў Менску аўстрыйскія турысты Гофа і Якобі яны наведалі Інстытут Беларускай Культуры, дзе знаёміліся з працай ІБК, у прыватнасьці з работамі слоўнікавай камісіі, і мелі доўгую гутарку з дырэктарам камісіі—праф. Эпімах-Шыпілам.

У Беларускім Дзяржаўным Музэі турысты вельмі зацікавіліся навачаснымі мастацкімі творамі беларускіх мастакоў.

Запрашэньне беларускіх пісьменьнікаў у Харкаў.

Гэтымі днямі Менск наведалі ўкраінскія пісьменьнікі т. т. Мамонт, Масэнка і Калтуя. Госьці пабывалі ў літаратурнай камісіі ІБК, дзе мелі доўгія гутаркі з прадстаўнікамі камісіі аб разьвіцьці пісьменства.

Украінскія госьці запрасілі на вясну ў Харкаў беларускіх пісьменьнікаў Янку Купалу, Якуба Коласа і Міхася Чарота для ўдзелу ў літаратурных вечарох.

Пра пасьведчаньні асобы.

СНК прыняў распрацаваны КЭП праэкт пастановы ЦВК і СНК пра пасьведчаньне асобы. Наводле гэтага праэкту дзяржаўным органам, службовым асобам, домакіраўніцтвам і інш. забараняецца патрабаваць ад грамадзян, каб яны абавязкова паказвалі дакуманты, якімі сьведчацца асобы, апрача выпадкаў, спэцыяльна прадугледжаных законамі. Пасьведчаньні выдаюцца грамадзянам па іх патрабаваньні сельскімі і местачковымі саветамі—у сельскіх мясцовасьцях, а ў гарадох—органамі Міліцыі. Пасьведчаньні асобы выдаюцца на неабмежаваны тэрмін.

ЧАРГОВЫЯ ЗАНЯТКІ У НЯДЗЕЛЬНЫМ КАМВУЗЕ.

У нядзелю, 12-га лютага, у 11 гадзін раніцы ў вялікай залі клюбу імя Карла Маркса адбудзецца чарговая лекцыя

У НЯДЗЕЛЬНЫМ КАМВУЗЕ НА ТЭМУ:

„ПОСТРОЕНИЕ ТЕОРИИ СОВЕТСКОЙ ЭКОНОМИКИ".

ЛЕКТАР ТАВ. ЛУР'Е.

МИНИМУМ: Ленин, т. XVI—„Экономика и политика в эпоху диктатуры пролетариата", стр. 347-356. Ленин, т. XVIII—«О продналоге», стр. 202-212—„О современной экономике России". «Плановое хозяйство» № 4 за 1927 год, статья А. Леонтьева. „К вопросу о природе хозяйства СССР". Бухарын – «Новые откровения о советской экономике в сборнике".—„Об экономической платформе оппозиции". Лапидус и Островитянов—„Полит. экономия в связи с теорией сов хозяйства", стр. 356-412.

МАКСИМУМ: „Плановое хозяйство № 6 за 1927 г." статья Менделсона—„Закон стоимости в сов. хозяйстве". Бухарин—„К вопросу о закономерностях переходного периода", в „Правде" №№ 148, 150, 153 за 1926 г. Праабражэнскі—„Новая экономика".

Мазырскі Загс наведамляе, што гр-н **ЗАХАРАЎ (КУРАШОЎ) Сяргей Васільевіч**, які паходзіць з гр-н Пскоўскай губ. і павету, а цяпер праж. у г. Калінкавічы, Мазырскай акр., зьмяняе прозьвішча **ЗАХАРАЎ - КУРАШОЎ** на прозьвішча **„СЬВЯТЛОЎ".**

Асоб, якія маюць перашкоды да зьмены прозьвішча, просяць наведаміць аб гэтым у Загс.

Віцебскі акруговы Загс наведамляе, што гр-ка **ЯГОРАВА Анісія Дзям'янаўна**, якая паходзіць з гр-н Смаленскай губ., Дзямідаўскага павету, Вярхоўскай вол., вёскі Цішымо, 1896 г. нараджэньня, пражыв. у г. Віцебску на Сталярнай вул. д. № 11, зьмяняе імя **АНІСІЯ** на імя **„ГАННА".**

Асоб, якія маюць перашкоды да зьмены імя, просяць наведаміць у 2 тыднёвы тэрмін у Загс.

ТЭАТР-КІНО.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЯЎРЭЙСКІ ТЭАТР БССР.

Чацьвер, 9-II. Спэктакль для рабочае моладзі **„ОВЕЧИЙ ИСТОЧНИК".** Білеты ў клюбе Кіму ад 7 да 10 гадз. веч.

Пятніца 10-II. **„Овечий источник".**

Білеты ў касе тэатру ад 12 да 2 гадз. дня і ад 5 да 9 гадз. веч.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА» — Грандыёзны фільм — **„Из-под сводов мечети".** Драма ў 7 часткі. Наступная пастаноўка—„Конец Санкт-Петербурга".

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА". Мастацкі баявік—вялікая ўсходняя пастаноўка **„Трижды проданная"** („ТАМИЛА"). У 7 частк. Штодня—4 сэансы.

КІНО «ПРАЛЕТАРЫ». — 3-ці ТЫДЗЕНЬ У МЕНСКУ! — **—) „ВАР'ЕТЭ". (—** Пачатак сэансаў у 7, 8 г. 45 хв. і 10 г. 30 хв. увечары.

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ". Грандыёзны труковы фільм **„Отрезанные от мира".** 1-я серыя ў 8 частк.

РЭДАКЦЫЯ ЧАКАЕ ТЭРМІНОВАГА АДКАЗУ

на адносіны з допісамі селькораў, якія накіраваны для расьследваньня і высьвятленьня:

Ад пракурора Бабруйскай акр. на № 142-а ад 4-VII 27 г.,
ад пракурора Менскай акр. на № 143-а ад 4-VII 27 г. і на № 162-а,
ад пракурора Віцебскай акр. на № 144-а ад 4-VII 27 г.,
ад Пятрыкоўскага РВК, Мазырск. акр. на № 146-а ад 4-VII 27 г. і на № 152-а ад 21-VII 27 г.,
ад міліцыі Сьмілавіцкага раёну на № 155-а ад 22-VII 27 г.,
ад Наркамзема БССР на № 156-а ад 23-VII 27 г.,
ад Пухавіцкага РВК на № 160-а ад 27-VII 27 г.,
ад Менскага акрземаддзелу на № 168-а ад 30-VII 27 г.,
ад Віцебскага РВК ад 30-VII 27 г.,
ад Касьцюковіцкага РВК, Магілеўскай акр., на № 171-а ад 1-VIII 27 г.,
ад Бабруйскага акр. праўленьня прафсаюзаў на № 172-а ад 1-VIII 27 г.,
ад пракурора Полацкай акр. на № 173-а ад 2-VIII 27 г.,
ад інспэктара Сацвыху НКА на № 175-а ад 8-VIII 27 г.,
ад Аршанскага рабфаку ячэйкі КП(б)Б на № 177-а ад 9-VIII 27 г.,
ад Самахвалавіцкага РВК Менск. акр. на № 179-а ад 10-VIII 27 г.,
ад пракурора Бабруйскай акр. на № 180-а ад 10-VIII 27 г.,
ад Менскага акр. інспэктара асьветы на № 184-а ад 20-VIII 27 г., на № 154-а і на № 188-а ад 26-VIII 27 г.,
ад Наркамасьветы на № 194-а ад 12-IX 1927 г.,
ад Астрашыцка-Гарадзецкага РВК на № 199-а ад 24-IX 27 г.,
ад Аршанскага акрвыканкому на № 201-а ад 28-IX 27 г.,
ад Мазырскага акрвыканкому на № 202-а ад 4-X 27 г.,
ад ЦП мэдсанпрацы на № 203-а ад 7-X 27 г.,
ад Магілеўскага акрвыканкому адд. аховы здароўя на № 204-а ад 18-X 27 г.,
ад НКА Галоўпрафасьветы на № 206-а ад 20-X 27 г.,
ад Аршанскага АВК зям. адд. на № 215-а ад 6-XII 27 г.,
ад аддзелу Камгаспадаркі (Менск) на № 219-а ад 12-XII 27 г.,
ад Слуцкага гарсавету, інспэктара Нарасьветы на № 221-а ад 15-XII 27 г.,
ад Слуцкага РВК на № 223-а ад 19-XII 1927 г.,
ад Чачэвіцкага РВК на № 224-а ад 19-XII 27 г.,
ад Магілеўскага акрземаддзелу на № 225-а ад 19-XII 27 г.,
ад Быхаўскага РВК на № 226-а ад 19 XII 27 г.,
ад Аршанскага АИВК на № 227-а ад 19-XII 27 г.,
ад Гомельскага Інспэктарыяту Лясоў на № 229-а ад 28-XII 27 г., і ад Узьдзенскага РВК на № 230-а ад 29-XII 27 г. і інш.

НАВУКА і ТЭХНІКА.

„Вадзяная заслона".

Нанава адчынены тэатр у Філядэльфіі (Амэрыка) зрабіў на сваёй сцэне вадзяную заслону. Над рампай праведзена водаправодная труба, у якой ёсьць многа дзірачак. Калі на ходу дзеі трэба спусьціць заслону, адчыняюць кран трубы і вада ліецца ўніз густой сьцяной, закрываючы сцэну ад публікі. Асьвятляючы вадзяную заслону рознакаляровымі пражэктарамі, тэатр дасягае прыгожых сьветавых эфэктаў.

Калі трэба «кадняць заслону», дык кран трэба зачыніць.

Ёд з чорнаморскіх водарасьляў.

Экспэдыцыя па вывучэньню водарасьляў Чорнага мора здабыла з глыбіні мора 135 тон водарасьляў. З іх вышла 3 тоны попелу, які ідзе на выраб ёду. Процант ёду ў водарасьлях зусім здавальняючы для таго, каб там паладзіць выраб ёду ў завадзкім абхвацe. Завод будзе даваць кожны месяц 2200 кілёграмаў ёду, коштам 15 р. за кілёграм. Замежны ёд каштуе значна даражэй.

Калегія Нар. Кам. Аховы Здароўя Украіны прызнала пабудову такога заводу на Украіне вельмі патрэбнай і перадала пытаньне на канчатковае вырашэньне ў Сав. Нар. Камісараў Украіны.

12 хвілін пад вадой.

Францускі вынаходца Ле-Прэр надумаў апарат, з якім можна даваць нырца на 10-12 хвілін. Ён вельмі карысны ў справе адратаваньня ўтопленікаў. Гэты апарат—невялікая камэра са здзьмутым паветрам; яна мае мэталёвую і матуястовую трубкі і надзяваецца на рот. У апараце ёсьць тры дзіркі: адна дзеля ўдыханьня, другая дзеля выдыханьня, а трэцяя мае гутаперчавы клапан, які ня пушчае ваду ў рот.

На лоб надзяецца другая частка апарату. Гэта—маска з акулярамі, перад якімі ўмацаваны два манометры: адзін паказвае колькасьць паветра, што яшчэ ёсьць у апараце, другі—сілу ціску выдыхаемага паветра, па якой можна ведаць глыбіню даннага месца пад вадой.

Маяк-аўтамат.

Аўтаматычны маяк нядаўна ўстаноўлен у ангельскім порце Гартлепулі. Абслугоўваючага пэрсаналу для маяка ня трэба і загараецца ён аўтаматычна вечарам, як пачынае цямнець. Тут працуе асаблівы мэханізм, які замыкае электрычны ток толькі з надыходам цемнаты ўсходняга стоніно. Раніцой ток размыкаецца, і маяк гасьне.

Правільнасьць працы маяка адзначае асобны кантрольны шчотчык, які дакладвае аб кожнай няспраўнасьці і паломцы галоўнага мэханізму ўсюшкай ліхтароў, павернутых у бок берагу.

Дзеля агульнага нагляду за правільнасьцю працы маяка досыць, каб да яго прыяжджаў інжынэр адзін раз на тыдзень.

Шкло, празрачнае толькі з аднаго боку.

Адзін ангельскі вынаходца запатэнтаваў вакольнае шкло, праз якое можна бачыць толькі ў адным напрамку. Дасягаецца гэта тым, што адзін бок шкла пакрываецца некім пластом залатога парашку. Шкло з гэтага боку мае залаты колер і ані не прасьвечваецца, так што праз яго нічога ня відаць. Другі бок шкла, не пакрыты залатым парашком, мае прыемную для вачэй залацістую афарбоўку, і калі глядзець праз яго з гэтага боку, дык яно празрачнае. Некаторыя прыватныя дамы і гатэлі ў Англіі зашклілі вокны гэтым новым шклом.

Апавяшчэньні.

Кансультацыя аб 10-ці-годзьдзі Чырвонай арміі.

— У суботу, 11 лютага, у 8 гадзін увечары ў цэнтральным габінэце агітпрапрацы адбудзецца кансультацыя т. Ірохмаля на тэму: 10 гадоў Чырвонай арміі. Запрашаюцца дакладчыкі ячэек, культаддзелы ЦП саюзаў і ячэйкавы актыў.

— Партыйная нарада па пытаньнях кіно, склікаемая АПА ЦК КП(б)Б, адбудзецца ў суботу, 11 лютага, у памяшканьні ЦК. Пачатак а 6 гадз. увечары. Уваход па разасланых запрашэньнях.

— НКРСІ і ЦП саюзу савгандльслужачых склікаюць у чацьвер, 9 лютага, а 7 гадзіне ўвечары ў памяшканьні клюбу савгандльслужачых шырокую нараду па пытаньні рацыяналізацыі судовай справы.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

— У пятніцу, 10 лютага, кіно: «6-ая часть мира». Сэансы ў 7 і 9 гадз. Карціну суправаджае музыка.

— У пятніцу, 10 лютага, а 7 з пал. гадзіне — нарада клюбных уважнаваных Ц. Д. Асьветы. Пасьля нарады - кіно.

Адказны рэдактар **М. КУДЗЕЛЬКА**.

АБАВЯЗКОВАЯ ПАСТАНОВА № 7

Менскага Гарадзкога Савету

8 лютага 1928 г.

аб рэгістрацыі дашкольных груп.

Менскі Гарадзкі Савет, на падставе зацьверджанага ЦВК і СНК БССР ад 2-га ліпеня 1927 г. «Палажэньня аб дашкольных установах» (апублікаванага ў газэце «Савецкая Беларусь» № 182 ад 13-8—27г.)

пастанаўляе:

1) Абавязаць усіх кіраўнікоў дашкольных груп (дзіцячых садоў, ачагоў і пляцовак), якія належаць кааперацыйным, прафэсыянальным і іншым арганізацыям, а таксама прыватным асобам, незалежна ад колькасьці дзяцей, зарэгістраваць з мэтай афармленьня іх існаваньня, на працягу двух тыдняў ад дню абвяшчэньня гэтае пастановы, свае ўстановы ў Гарадзкога Інспэктара дашкольных устаноў, падаўшы зьвесткі па наступнай форме:

а) Якой арганізацыі належыць група і месца яе знаходжаньня.
б) Прозьвішча, імя і асьвета кіраўніка групы.
в) Лік дзяцей у групе.
г) Сацыяльны склад дзяцей.
д) Месца працы бацькоў дзяцей.

2) Нагляд за выкананьнем гэтае пастановы ўскладаецца на Гарадзкога Інспэктара дашкольных устаноў.

3) Вінаватыя ў парушэньні гэтае пастановы падлягаюць пакараньню ў адміністрацыйным парадку штрафам да 50 рублёў, ці прымусовымі работамі да 14-ці дзён.

Старшыня Менскага Гарадзкога Савету **ЯЦКЕВІЧ**.

Сэкратар Менскага Гарадзкога Савету **ПАСЫНКОЎСКІ**.

БАЛЯНС

Беларускага Сельска-Гаспадарчага Банку на 1 студзеня 1928 г.

Каса і бягучыя рахункі	666.447	17
Каштоўнасьці	5	02
Дыскont і спэц. бягуч. рах. п.-вэксалі	2.355.548	93
Тавара-закладовыя апэрацыі	870.363	91
Мэтавыя пазыкі	15.382.036	32
Пратэрмінаваныя пазыкі	28.632	61
Карэспандэнты	26.444	65
Розныя дабіторы	13.641	36
Маемасьць і ўдзел у прадпрыемствах	898.250	24
Выдаткі наступных гадоў	550	71
Апэрацыйныя выдаткі бягучага году	156.830	48
Адміністрацыйныя выдаткі бягучага году	16.031	20
БАЛЯНС	20.414.782	60

Асноўны капітал	3.229.344	37
Іншыя ўласныя капіталы і фонды	4.915.206	15
Старонныя сродкі для мэтав. крэдыт	2.113.596	59
Пазыкі ўнутры сыстэмы с.-г. крэдыту	6.486.117	17
Перадысконт і перазалог	1.459.951	93
Уклады і бягучыя рахункі	1.322.213	64
Сумы да патрабаваньня	7.957	48
Карэспандэнты	83.681	39
Розныя крэдыторы	99.605	61
°/₀°/₀ і прыбыткі наступных гадоў	6.214	14
Апэрацыйныя прыбыткі бягучага году	346.508	75
Прыбытак 1926-27 году	344.385	38
БАЛЯНС	20.414.782	60

Старшыня Праўленьня ДУБІНА.

Член Праўленьня Е. ТРАФІМАЎ.

За Галоўн. Бухгальтара ФЕДАРОВІЧ.

Галоўлітбел 302.

1 Дзярж. друкарня.